**Уладзімір Емяльянчык**
**Язэп Юхо**

# «Нарадзіўся я ліцьвінам...»

## Тадэвуш Касцюшка

Мінск
Навука і тэхніка
1994

Емяльянчык У., Юхо Я.

«Нарадзіўся я ліцьвінам…»: Тадэвуш Касцюшка.- Мн., Навука і тэхніка, 1994 (Нашы славутыя землякі) - 68с.

ISBN: 5-343-01483-6

У папулярнай форме апавядаецца пра слаўны і драматычны лёс Андрэя Тадэвуша Касцюшкі (1745—1817), нацыянальнага героя Беларусі, Зпучаных Штатаў Амерыкі і Польшчы, ганаровага грамадзяніна Францыі. Для шырокага кола чытачоў.

## Да чытача

Перад Вамі выданне, галоўны ініцыятар і фундатар якога – культурны асяродак «Беларусь» г. Алматы. Гэта не першая наша акцыя па ўшанаванні памяці славутага суайчынніка: пры канцы 1991 года мы ў сваім звароце нагадалі нашым землякам, а таксама дзяржаўным і грамадскім арганізацыям Злучаных Штатаў Амэрыкі, Польшчы, Францыі пра набліжэнне 250-годдзя з дня нараджэння Андрэя Тадэвуша Банавентуры Касцюшкі, звярнуліся да тагачасных пасланнікаў ЗША ў Расеі і Казахстане з такім жа лістом, выпусцілі значок «Тадэвуш Касцюшка. За вольнасць нашу і вашу. 1745–1817», стварылі фонд «Марачоўшчына – Т. Касцюшка» і яго філію ў Івацэвіцкім раёне Беларусі, імкнемся стварыць хоць бы часовы дом-музей Касцюшкі ў Косаве да яго юбілею і г.д. Усё гэта, зразумела, робіцца без усялякай камэрцыйнай выгады, амаль без дапамогі дзяржаўных органаў Беларусі, але пры маральнай падтрымцы многіх сведамых людзей, перадусім Адама Мальдзіса, Язэпа Юхо, Алега Трусава, Зміцера Бубноўскага. Асабліва своечасовая тая ўвага, якую аддае ўшанаванню памяці сына беларускай зямлі, брыгаднага генерала войска Злучаных Штатаў Амэрыкі, героя вайны за незалежнасць гэтае краіны, яе амбасадар у Рэспубліцы Беларусь сп. Дэвід Сўорц.

Часта пытаюцца, што вымушае нас, жыхароў далёкай ад Беларусі Алматы, ахвяравацца сродкамі, траціць свой час на ўшанаванне памяці, на жаль, мала вядомага многім грамадзянам Беларусі Тадэвуша Касцюшкі.

Па-першае, гэта паралелі, якія знаходзяць на сваім жыццёвым шляху многія цяперашнія беларусы блізкага замежжа з лёсам знакамітага земляка. Тадэвуш Касцюшка сцвярджаў, што ён – ліцьвін (па-сучаснаму – беларус) і імкнецца служыць сваёй радзіме – Вялікаму Княству Літоўскаму, але яго, вядомага генерала з баявым досведам, не дапускалі на службу. Касцюшка выступаў супраць анексіі Расеяй, Прусіяй і Аўстрыяй Вялікага Княства і Польскага Каралеўства, узначальваў паўстанне супраць

захопнікаў. Ідэі і справы гэтага паўстання ўжо амаль 200 гадоў натхняюць пакаленні беларусаў на барацьбу за сваю незалежнасць. Вайсковы і палітычны талент Тадэвуша Касцюшкі прызналі і шанавалі яго сябры (Дж. Вашынгтон, Т. Джэфэрсан і іншыя), праціўнікі (А. Сувораў, Кацярына II, Павел I, Аляксандар I, Напалеон ды іншыя). Касцюшка не стаў дапамагаць Напалеону ў яго вайне супраць Расеі, але не стаў ён і на бок Аляксандра, бо бачыў, што чужынцы не дадуць сапраўднай незалежнасці яго Бацькаўшчыне. Касцюшка рабіў усё, каб палегчыць лёс палонных беларусаў і палякаў, якія змагаліся ў войску Напалеона.

У Савецкай Беларусі пра Тадэвуша Касцюшку імкнуліся не ўспамінаць: касавалі асобныя спробы адрадзіць Марачоўшчыну як нацыянальны музей, прапагандавалі праз Кобрынскі музей ды іншымі шляхамі ідэі Суворава і памяць пра яго як сымболь вайсковай магутнасці Расейскай імперыі, не дапускалі імя Касцюшкі ў гістарычную беларускую літаратуру, сцвярджалі, што ён паляк, і г.д. У сучаснай Беларусі нямала людзей, якія засвоілі гісторыю паводле Карамзіна-Абэцэдарскага, і Касцюшка для іх – чужынец. Таму нялёгка далося перанайменне вуліцы Чырвонаармейскай у Косаве на, бадай, першую ў Беларусі вуліцу Касцюшкі. Яшчэ болей складаныя «гульні» назіраюцца цяпер пры адводзе надзелу зямлі пад комплекс часовага доміка-музея Касцюшкі ў Косаве.

Вельмі многія беларускія афіцэры бачаць, што іх, як у свой час Касцюшку, таксама стараюцца не дапусціць у беларускае войска. Вельмі абыякавае сёння стаўленне многіх дзяржаўных органаў да беларускай мовы як дзяржаўнай, да прытоку нацыянальна сведамых беларусаў – навукоўцаў, інжынераў, дзеячоў розных галінаў культуры ў межы Бацькаўшчыны, да пашырэння і ўмацавання нацыянальнай сведамасці ў колах навуковай і тэхнічнай інтэлігенцыі.

Па-другое, ушанаванне памяці Касцюшкі ў Беларусі як вядомага ўсяму свету вайскова-палітычнага дзеяча адкрывае для нас новыя старонкі мінуўшчыны нашай Айчыны, вымагае сістэмнага разгляду беларускай ваеннай гісторыі, развіцця нацыянальнай палітычнай думкі.

Па-трэцяе, у сённяшняй Беларусі ды за межамі многіх палохаюць беларускім нацыяналізмам. Жыццёвы прыклад Касцюшкі паказвае, што можна любіць сваю Бацькаўшчыну і зрабіць для яе надта многа без шкоды для людзей іншай нацыянальнасці і незалежна ад таго, жывеш ты сёння на радзіме ці далёка ад яе.

І ўрэшце, не трэба забывацца, што Тадэвуш Касцюшка вельмі шмат зрабіў для станаўлення незалежнасці ЗША, Польшчы, Францыі. Яго там добра памятаюць і ўшаноўваюць. Гэта робіць дачыненні тых гаспадарстваў да Беларусі як да дзяржавы, што будуе сваю незалежнасць, болей цёплымі. Многія краіны, каб стварыць такое пацяпленне, затрачваюць нямала намаганняў. Чаму ж сёння не выкарыстоўваць гэта ў інтарэсах народа Беларусі?

Акрамя таго, нам вядома, што першая кніга пра Т. Касцюшку «За вольнасць нашу і вашу», напісаная Язэпам Юхо і выдадзеная ў 1990 годзе ў серыі «Нашы славутыя землякі», даўно стала бібліяграфічнай рэдкасцю.

Мы ўпэўненыя, што знаёмства з новай кнігай пра славутага ліцьвіна дасць усім нам магчымасць прыгледзецца да павучальнага жыццёвага шляху Тадэвуша Касцюшкі, зразумець яго жыццёвыя ідэі і ганарыцца сваім земляком.

*Яўген Майсейчык, адказны сакратар Рады культурнага асяродка «Беларусь»*

*21 траўня 1993 года, г. Алматы*

## Шлях у жыццё

### Сяхновічы ці Марачоўшчына?

Андрэй Тадэвуш Банавентура Касцюшка нарадзіўся ў небагатай сям'і беларускага шляхціча, фамільны маёнтак якога знаходзіўся ў вёсцы Сяхновічы Кобрынскага павета (цяпер у Жабінкаўскім раёне). Дакладная дата яго нараджэння невядомая, выказана меркаванне, што ён нарадзіўся 4 лютага 1746 года, аднак больш праўдападобна, што адбылося гэта 30 лістапада 1745 года. Дату 4 лютага прапанаваў польскі даследнік Т. Корзан зыходзячы з метрыкі, адкуль відаць, што яго хрысцілі ў Косаўскім касцёле 12 лютага 1746 года. Аднак ёсць падстава меркаваць, што спачатку яго хрысцілі ў вуніяцкай царкве і назвалі Андрэем у гонар апостала Андрэя Першазванага, свята якога прыпадае на 30 лістапада. Такое меркаванне грунтуецца таксама на тым, што яго маці Фёкла (Тэкля) была з беларускага праваслаўна-вуніяцкага роду Ратамскіх. У пасаг Тэкля Ратамская атрымала маёнтак Дразы Барысаўскага павета. Яе родны брат Марцін быў падкаморым Аршанскага павета. Вядома, што дзяцей, раней хрышчаных у цэрквах, часта паўторна хрысцілі ў касцёлах. На працягу ўсяго свайго жыцця Касцюшка быў абыякавы да канфесійных пытанняў, нягледзячы на тое што навучаўся ў каталіцкай школе. (Тым не менш свой ордэн Цынцыната, атрыманы з рук Дж. Вашынгтона, Т. Касцюшка ахвяраваў (у 1784–1785 гг.) вуніяцкай царкве ў в. Даўгаліскі Люблінскага ваяводства. Гэтую царкву наведвалі і маліліся ў ёй маці, сястра Ганна і сам Тадэвуш Касцюшка.)

У сваім імкненні замаўчаць, схаваць беларускае паходжанне Касцюшкі нават аўтарытэтная сучасная Wielka Encyklopedia Powszechna сцвярджае, што ён нібыта нарадзіўся на Валыні, якая з 1569 года была далучаная да Польшчы. Сам жа Касцюшка называў сябе ліцьвінам, г. зн. так, як называлі сябе ў тым часе ўсе беларусы[1].

[1] Korzon T. Kościuszko, biografia z dokumentów wysnuta. Kraków; Warszawa, 1894. S.206.

На думку біёграфаў, ён нарадзіўся ў вёсцы Сяхновічы, што пацвярджаецца надпісам на медалі, вырабленым у Парыжы ў 1818 годзе[2]. Паказваюць таксама на маёнтак Марачоўшчына каля мястэчка Косава (цяпер у Івацэвіцкім раёне) як на месца яго нараджэння. Аднак у абодвух выпадках размова ідзе пра Беларусь, а не пра Валынь ці Польшчу.

## Дзіцячыя гады

У гістарычных дакументах прозвішча Касцюшка сустракаецца з 1458 года. Продкі Андрэя Тадэвуша займалі сціплае становішча ў грамадстве. Яго прадзед Аляксандар Іван быў падсудкам, а дзед Амбражэй – пісарам у Берасцейскім земскім судзе. Бацька Людвік ніякіх пасадаў не займаў, а меў толькі ганаровую годнасць мечніка Берасцейскага ваяводства і палкоўніка, хоць у войску ніколі не служыў.

У сям'і Тэклі і Людвіка Касцюшкаў было чацвёра дзяцей: Ганна, Язэп, Кацярына і Андрэй Тадэвуш. Да дзевяці гадоў Андрэй Тадэвуш выхоўваўся дома, як і ўсе дзеці незаможнай шляхты, без якіх-небудзь спецыяльных гувернёраў ці настаўнікаў, г. зн. яго маленства прайшло ў беларускай вёсцы. У дзевяць гадоў яго аддалі ў школу манаскага ордэна піяраў мястэчка Любешаў Пінскага павета, дзе ён навучаўся пяць гадоў, да 1760 года. Пасля сканчэння школы ён зноў вярнуўся ў Сяхновічы і цягам пяці гадоў дапамагаў маці па гаспадарцы (бацька памёр у 1758 годзе). У піярскай школе Касцюшка вывучаў лацінскую, польскую, французскую і нямецкую мовы, атрымаў пачатковыя веды з матэматыкі.

## Рэч Паспалітая – канфедэрацыя Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага

Рэч Паспалітая Двух Народаў, якая ўтварылася ў выніку Люблінскай вуніі 1569 года, была канфедэрацыяй

[2] Dihm J. Kościuszko nieznany. Wrocław etc., 1969, S.384.

Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага. Кожная з гэтых дзяржаваў мела сваю тэрыторыю, сваю эканоміку і фінансы, сваё войска, асобную адміністрацыю і заканадаўства.

Суверэнныя правы Вялікага Княства Літоўскага атрымалі юрыдычнае замацаванне ў Статуце 1588 года. Законам ад 19 траўня 1655 года пацвярджалася забарона польскім войскам пераходзіць дзяржаўную мяжу Вялікага Княства.

## Бязладдзе дзяржаўных органаў улады

У Рэчы Паспалітай кароль быў без улады, Сойм без сілы, а іншых сталых органаў улады і кіравання для ўсёй канфедэрацыі не было. У другой палове XVIII стагоддзя яна перажывала крызіс грамадскага і палітычнага ладу. Нарастала незадаволенасць сялян сваім становішчам. Да сялянскіх паўстанняў і бунтаў дадавалася жорсткая барацьба розных групаў унутры панавальнага стану – шляхты, а таксама барацьба за свае правы праваслаўнага насельніцтва. Рэлігійнае пытанне ўвесь час імкнулася выкарыстаць Расейская імперыя для апраўдання ўмяшання ў нутраныя справы суседзяў.

У гады юнацтва Тадэвуша Касцюшкі, г. зн. у сярэдзіне 60-х гадоў XVIII стагоддзя, была арганізаваная спроба дзяржаўных рэформаў у Рэчы Паспалітай. Прагрэсіўныя дзеячы імкнуліся прыстасаваць стары феадальны дзяржаўны апарат да новых эканамічных умоваў. У 1764 годзе яны паспрабавалі наладзіць работу Сойму і абмежаваць выкарыстанне дэпутатамі права «лібэрум вета». У 1767 годзе праваслаўная шляхта абвясціла хаўрус (гэтак званую канфедэрацыю) у Слуцку, а пратэстанцкая – у Торуні з патрабаваннем ураўноўвання ў правах праваслаўных і пратэстантаў з каталікамі. На патрабаванне расейскага пасла Рапніна ў лютым 1768 года ў Варшаве была падпісаная дамова з Расеяй, згодна з якой фармальна абвяшчалася роўнасць у правах праваслаўных з каталікамі.

У гэтым жа часе былі падрыхтаваныя гэтак званыя Кардынальныя правы Рэчы Паспалітай, якія абвяшчаліся непарушнымі пад гарантыяй Расеі. У іх замацоўваліся

непахіснасць «лібэрум вета», шляхоцкія прывілеі і недапушчальнасць рэформаў дзяржаўнага ладу. Яшчэ ў сакавіку 1764 года Расея і Прусія дасягнулі дамоўленасці, каб не дапускаць сілаю зброі якіх-небудзь рэформаў дзяржаўнага ладу ў Рэчы Паспалітай. Гэтае пагадненне сталася перадумовай будучага падзелу. Кардынальнымі правамі амаль поўнасцю былі ліквідаваныя рэформы, праведзеныя ў 1764 годзе. Галоўным новаўвядзеннем у Кардынальных правах быў пункт XX, паводле якога ў Польшчы ўводзіўся ў дзеянне артыкул першы раздзела XII Статута Вялікага Княства Літоўскага 1588 года, дзе прадугледжвалася крымінальная адказнасць, аж да пакарання смерцю, шляхціча за забойства простага чалавека.

Супраць Варшаўскага пагаднення 1768 года аб ураўноўванні ў правах праваслаўных з каталікамі ў г. Бары (Заходняя Ўкраіна) была ўтвораная канфедэрацыя, якая заклікала да барацьбы за аднаўленне перавагаў каталіцкай рэлігіі, супраць умяшання замежных дзяржаваў, за захаванне ўсіх правоў і прывілеяў шляхты. Барская канфедэрацыя карысталася падтрымкай Францыі, якая падбухторыла Турэччыну на вайну з Расеяй. Прусія і Аўстрыя, скарыстаўшы тое, што Расея занятая вайной з Турэччынай, у 1770 годзе акупавалі частку польскіх земляў і прапанавалі Расеі ўзяць удзел у падзеле Рэчы Паспалітай. 5 жніўня 1772 года ў Пецярбурзе была падпісаная канвенцыя аб першым падзеле Рэчы Паспалітай. Да Аўстрыі, паводле канвенцыі, далучалася паўднёвая Польшча і частка Заходняй Украіны з гарадамі Перамышлем, Альбовам (старадаўні беларускі назоў места Львова), Галічам, да Прусіі – паўночна-заходняя частка Польшчы з гарадамі Быдгашч, Хелмно, да Расеі – Латгалія і ўсходняя частка Беларусі з гарадамі Полацкам, Віцебскам, Воршай, Магілевам, Рагачовам, Гомелем. (Толькі невялікая частка паслоў з Вялікага Княства Літоўскага, у тым ліку наваградскія, менскія і ваўкавыскія на чале з легендарным Тадэвушам Рэйтанам, спрабавалі ў Варшаве на «падзельным» сойме 1773 года сарваць зацверджанне падзелу. Але сіла была не на баку патрыётаў з Вялікага

Княства. Адзін з іх, Самуль Корсак, браў потым чынны ўдзел у паўстанні 1794 года і загінуў пры абароне Варшавы.)

Першы падзел выявіў бязладдзе ў Рэчы Паспалітай і паказаў на неабходнасць рэформаў дзяржаўнага ладу. У 1775 годзе была зробленая спроба стварыць у гаспадарстве калегіяльны выканаўча-распарадчы орган, які б выконваў функцыі ўрада па найбольш важных пытаннях дзяржаўнага кіравання. З гэтаю мэтай была створаная Неадменная рада з 36 чалавек – 18 прадстаўнікоў Сената і 18 дэпутатаў ад шляхты. Аднак яе дзейнасць знаходзілася пад уплывам невялікай групы магнатаў і расейскага пасла, у сувязі з чым гэтая рада, называная ў прагрэсіўных колах «радаю здрады», была не здольная кіраваць дзяржаўнымі справамі. Яе зліквідавалі ў 1789 годзе. Гэтыя падзеі паўплывалі на фармаванне дэмакратычнага светапогляду Т. Касцюшкі.

## У корпусе кадэтаў

У 1764 годзе каралём Польшчы быў выбраны ўраджэнец Беларусі (маёнтак Воўчын Берасцейскага павета) Станіслаў Аўгуст Панятоўскі, пляменнік канцлера Вялікага Княства Літоўскага Міхала Чартарыйскага. А паколькі сям'і Касцюшкі спрыяў прыхільнік Чартарыйскіх палявы пісар Вялікага Княства Літоўскага Язэп Сасноўскі, прызначаны крыху пазней ваяводам полацкім, то дзякуючы яго пратэкцыі Касцюшка 18 снежня 1765 года быў прыняты ў нанова створаны Варшаўскі кадэцкі корпус. Прыкладна ў тым часе ў корпусе кадэтаў вучыліся князі Казімір Сапега, Антон Радзівіл, Мацвей Ябланоўскі і магнаты Валовіч, Чацвярцінскі ды іншыя. Шэфам корпуса кадэтаў з'яўляўся сам кароль. Непасрэдным начальнікам быў князь Адам Казімір Чартарыйскі.

Усяго ў корпусе налічвалася 80 кадэтаў. Касцюшка быў у спісе 79-м. Крыху пазней колькасць кадэтаў скарацілі да 60 і падзялілі на брыгады па 20 чалавек. У кожнай брыгадзе былі брыгадзір і падбрыгадзір.

Кадэты займаліся шыхтавой падрыхтоўкай, фехтаваннем, вершніцтвам, вывучалі тактыку, літаратуру і гісторыю,

мовы лацінскую, нямецкую, французскую, арыфметыку, геаметрыю і вышэйшую матэматыку, фізіку, палітычную эканомію, адным з асноўных прадметаў была артылерыя. У 1767/68 навучальным годзе з ліку кадэтаў была ўтвораная група, якая займалася вайскова-інжынернымі дысцыплінамі. У гэтую групу быў улучаны і Касцюшка. Асаблівая ўвага там аддавалася вывучэнню геаграфіі і трыганаметрыі.

Вольны час многія кадэты бавілі ў велікасвецкіх салонах. Тадэвуш Касцюшка часта ўхіляўся ад такіх забаваў, займаўся навукамі і за сваю ўпартасць у дасягненні мэты, дысцыплінаванасць і амаль спартанскі лад жыцця атрымаў ад калегаў мянушку «швед».

Выдатныя здольнасці і настойлівасць дазволілі Касцюшку стаць адным з найлепшых кадэтаў. 20 снежня 1766 года ён атрымаў званне харужага. Адначасова з працягам вучобы быў прызначаны на пасаду падбрыгадзіра з заробкам 72 залатоўкі на месяц. Пра далейшыя поспехі ў вучобе і службе сведчыць тое, што ў 1769 годзе ён атрымліваў ужо 200 залатовак на месяц.

## Пачатак барацьбы

### У Францыі

З мэтай удасканалення ведаў у навуках і асабліва ў вайсковым і цывільным будаўніцтве ў другой палове 1769 года Касцюшка выехаў на вучобу ў Францыю. Гэтая паездка была ажыццёўленая пры матэрыяльнай падтрымцы караля, а таксама князя Адама Чартарыйскага. У Парыжы Касцюшка наведваў заняткі ў Акадэміі жывапісу і скульптуры, браў урокі ваеннай архітэктуры, артылерыі і тактыкі. Акрамя таго, А. Чартарыйскі рэкамендаваў яму вывучаць будаўніцтва мастоў, шлюзаў, дарог, каналаў, плацін.

### Напярэдадні Французскай рэвалюцыі

Амаль пяцігадовае знаходжанне Касцюшкі ў Францыі супала па часе з рэвалюцыйнай сітуацыяй, якая склалася там. Палітычная думка французскіх асветнікаў Вальтэра, Ш. Л. Мантэск'ё і асабліва Ж. Ж. Русо была накіраваная на крытыку аджылых феадальных парадкаў. Промні іх асветніцкай дзейнасці ўсё выразней высвечвалі шлях да ўсталявання больш справядлівага грамадства і дэмакратычнай дзяржавы.

Хоць нам невядома, з кім непасрэдна сустракаўся Касцюшка ў Парыжы, чые лекцыі слухаў, якія кнігі і артыкулы чытаў, аднак бясспрэчна, што на яго велізарны ўплыў зрабілі французскія асветнікі, якія ў гэтыя гады апублікавалі сваю выдатную працу – Вялікую Французскую Энцыклапедыю. Ёсць падстава меркаваць, што яму былі вядомыя працы Ж. Ж. Русо, асабліва «Аб грамадскай дамове, або Прынцыпы палітычнага права» і «Меркаванні пра спосаб кіравання ў Польшчы і праект яго змянення, складзены ў красавіку 1772 года». Апошні з названых трактатаў быў у тым жа годзе перададзены паслу Рэчы Паспалітай у Парыжы кухмістру Вялікага Княства Літоўскага Міхаілу Вяльгорскаму, і, напэўна, з ім былі азнаёмленыя суайчыннікі, што жылі ў Парыжы. Уплыў поглядаў Ж. Ж. Русо на

Касцюшку асабліва яскрава праявіўся ў перыяд паўстання ў 1794 годзе.

Бясспрэчна, знаходжанне ў Францыі спрыяла ўсталяванню ў Касцюшкі рэспубліканскага светапогляду і з'явілася галоўнай школай новай грамадска-палітычнай думкі, у якой абвяшчаліся найважнейшыя дэмакратычныя лозунгі – свабода, роўнасць і братэрства.

## Вяртанне на радзіму. Хатні настаўнік. «Галубкі не для вераб'ёў»

Пасля кароткага падарожжа ў Ангельшчыну, Італію, Швайцарыю і Нямеччыну ўлетку 1774 года Касцюшка вярнуўся ў Варшаву. (Ю. Нямцэвіч, Ф. Пашкоўскі ды іншыя лічаць, што Касцюшка вярнуўся з Францыі ў 1773 годзе.) Аднак там у войску афіцэрскай пасады яму не знайшлося. Атрымаць яе тады можна было, толькі заплаціўшы грошы (напрыклад, за пасаду капітана – 18 тысяч залатовак). Такіх грошай ні ў Касцюшкі, ні ў яго блізкіх не было. Знаходзячыся ў цяжкім матэрыяльным становішчы (брат растраціў не толькі сваю маёмасць, але і частку ягонай), ён быў вымушаны згадзіцца пайсці на пасаду хатняга настаўніка да смаленскага ваяводы, а з 1775 года палявога гетмана Вялікага Княства Літоўскага Язэпа Сасноўскага і навучаць яго дачок Людвіку і Кацярыну маляванню. Якія былі поспехі вучаніц у жывапісе, невядома. Вядома толькі, што старэйшая Людвіка закахалася ў свайго настаўніка, ён адказаў узаемнасцю і яны намерыліся ажаніцца. А паколькі бацькі Людвікі былі супраць шлюбу іх дачкі з бедным шляхцічам, то маладыя наважыліся абвянчацца ўпотай. Але іх намер стаў вядомы бацьку і шлюб разладзіўся. Нібыта пра іх было сказана: «Галубкі не для вераб'ёў, а дочкі магнатаў не для шляхцюкоў».

## У барацьбе за незалежнасць Злучаных Штатаў Амэрыкі

Не знайшоўшы сабе занятку на радзіме, Касцюшка ўвосень 1775 года зноў выехаў у Францыю, а ўлетку

наступнага – у Паўночную Амэрыку, дзе тым часам пачалася вайна супраць ангельскага каланіяльнага ўладарніцтва. Гэтая вайна, па сутнасці, была буржуазнай рэвалюцыяй, якая выклікала да жыцця моцны дэмакратычны рух. Несумнеўна, рэвалюцыйныя ідэі барацьбы за незалежнасць і свабоду амэрыканскага народа былі блізкія Касцюшку. У жніўні 1776 года Касцюшка прыбыў у Амэрыку і 18 кастрычніка быў залічаны ў войска ў званні палкоўніка.

На працягу сямі гадоў Касцюшка змагаўся ў шэрагах амэрыканскай арміі. Асабліва каштоўныя былі яго веды як вайсковага інжынера, бо войска складалася ў асноўным з фермераў і простых месцічаў, мела вострую патрэбу ў прафесійных вайскоўцах. Першым сур'ёзным выпрабаваннем яго таленту было складанне праекта і будаўніцтва ўмацаванняў на берагах ракі Дэляўэр для аховы Філядэльфіі, дзе ў тым часе было сканцэнтравана кіраўніцтва барацьбой за незалежнасць. У Філядэльфіі збіраліся першы і другі кантынентальныя кангрэсы прадстаўнікоў калоній, якія ўзняліся на барацьбу за незалежнасць. Тут жа была прынятая Канстытуцыя ЗША. Аб значэнні Філядэльфіі сведчыць і той факт, што на працягу 10 гадоў горад быў сталіцай краіны. Касцюшка выдатна справіўся з заданнем, у сувязі з чым Рада бяспекі штата Пэнсыльванія ўзнагародзіла яго дадатковай сумай грошай.

Увесну 1777 года галоўная небяспека для Злучаных Штатаў навісла з поўначы, дзе ангельцы, дзейнічаючы з Канады і Нью-Ёрка, рыхтаваліся разграміць паўстанцаў. У сувязі з гэтым паводле пастановы Кангрэса была створаная армія Поўначы, у якую галоўным інжынерам быў прызначаны Касцюшка.

Вялікага поспеху Паўночнае войска дамаглося ў бітве пад Саратогай, дзе было разгромленае буйное злучэнне ангельскай арміі. Гэтая перамога ў значнай ступені была дасягнутая дзякуючы добрым фартыфікацыйным умацаванням, пераадолець якія ангельцам не ўдалося. Яна паслужыла пачатковым этапам паразы Ангельшчыны, узняла дух амэрыканскага войска і яго аўтарытэт у Эўропе, садзейнічала афіцыйнаму прызнанню эўрапейскімі краінамі

дзяржаўнай самастойнасці Злучаных Штатаў Амэрыкі.

Начальнік войска ў афіцыйным рапарце Кангрэсу адзначаў, што палкоўнік Касцюшка дакладна выбраў і адмыслова ўмацаваў пазіцыі. Пасля бітвы пад Саратогай прозвішча Касцюшкі ведаў ўжо і Джордж Вашынгтон. У лісце старшыні Кангрэсу 10 лістапада 1777 года ён пісаў, што Касцюшка «з'яўляецца чалавекам навукі і вышэйшых якасцяў. Згодна з атэстацыяй, якую маю аб ім, заслугоўвае, каб мець яго на прыкмеце»[3].

На пачатку 1778 года Кангрэс прыняў пастанову аб стварэнні фартэцы на ўзбярэжжы ракі Гудзон, у сувязі з чым Вашынгтон на пасаду галоўнага інжынера прапанаваў кандыдатуру Касцюшкі, які і быў зацверджаны Кангрэсам. На працягу двух з паловай гадоў Касцюшка кіраваў будаўніцтвам найвялікшай цытадэлі Злучаных Штатаў у Ўэст-Пойнце, дзе адзін час знаходзілася і штаб-кватэра Вашынгтона. Пазней у Ўэст-Пойнце была створаная Вайсковая акадэмія ЗША. (У 1830 годзе там быў пастаўлены помнік Т. Касцюшку.)

Пасля паразы на поўначы ангельцы паспрабавалі дамагчыся поспеху на поўдні, куды былі перанесены галоўныя ваенныя дзеянні. Для арганізацыі аховы паўднёвых штатаў Кангрэс арганізаваў Паўднёвую армію, галоўным інжынерам у якую быў прызначаны Касцюшка. У гэтым войску ён не толькі займаўся інжынернымі работамі – умацаваннямі, мастамі, пераправамі, але і камандаваў баявымі лінейнымі аддзеламі.

Наколькі высокі быў аўтарытэт Касцюшкі ў Амэрыцы, могуць сведчыць лісты найвышэйшых службовых асобаў ЗША. Так, Вашынгтон у лісце да генерала Грына ў 1780 годзе пісаў, што ён добра пазнаёміўся з Касцюшкам і высока цэніць яго веды, агульныя паводзіны і настойлівасць, з якімі ён праводзіў работы ў Ўэст-Пойнце. Генерал Грын адзначаў, што сярод яго таварышаў па зброі найбольш карысным і прыемным быў палкоўнік Касцюшка. За выдатныя заслугі Кангрэс ЗША 13 кастрычніка 1783

[3] Kopczewski J. S. Tadeusz Kościuszko w historji i tradycji. Warszawa, 1968. S.360.

года надаў яму званне брыгаднага генерала і ў пастанове запісаў, каб ваенны міністр «выдаў палкоўніку Касцюшку дыплом на званне брыгаднага генерала і засведчыў гэтаму афіцэру, што Кангрэс прасякнуты высокім усведамленнем яго працяглых і асабліва каштоўных заслугаў».

За баявыя заслугі Касцюшка ў ліку трох іншаземцаў быў узнагароджаны сама высокім баявым ордэнам ЗША – ордэнам Цынцыната і прыняты ў склад «Таварыства Цынцынатаў», ганаровым сябрам якога быў Дж. Вашынгтон. Акрамя таго, Касцюшка атрымаў амэрыканскае грамадзянства, пажыццёвую пенсію і зямельны надзел, а таксама ў якасці асабістага падарунка ад Вашынгтона пару пісталетаў.

## Тадэвуш Касцюшка і Томас Джэфэрсан

Знаходзячыся ў Злучаных Штатах, Тадэвуш Касцюшка пазнаёміўся і пасябраваў з многімі выдатнымі людзьмі гэтай краіны. Ён браў актыўны ўдзел і ў грамадскім жыцці, быў блізка знаёмы з многімі вайсковымі і палітычнымі дзеячамі таго часу. У прыватнасці, сябраваў з Томасам Джэфэрсанам, аўтарам Дэкларацыі незалежнасці, абраным у 1800 годзе прэзідэнтам ЗША. Аб дружбе Касцюшкі з Джэфэрсанам і блізкасці іх грамадска-палітычных поглядаў сведчыць тэстамант Касцюшкі наступнага зместу: «Я, Тадэвуш Касцюшка... гэтым сведчу і пастанаўляю: у выпадку, калі потым я не распараджуся ў маім тэстаманце інакш сваёй уласнасцю, што знаходзіцца ў Злучаных Штатах, то даручаю майму сябру Томасу Джэфэрсану цалкам выкарыстаць гэтую маёмасць на выкуп мурынаў, якія належаць яму самому або іншым, на дараванне ім волі ад майго імя, на навучанне іх рамёствам або іншым навукам, на выхаванне ў іх маральных якасцяў, якія дапамогуць ім стаць добрымі суседзямі, добрымі бацькамі і маткамі, мужамі і жонкамі, на выхаванне ў іх сумленнага стаўлення да грамадзянскіх абавязкаў і перадусім да абароны сваёй свабоды, сваёй краіны і добрага грамадскага парадку, на іх узгадаванне ва ўсім тым, што можа зрабіць іх

шчаслівымі і карыснымі. Я прызначаю вышэйназванага Томаса Джэфэрсана выканаўцам гэтага тэстаманту»[4].

У Дэкларацыі незалежнасці ЗША, падрыхтаванай Т. Джэфэрсанам у 1776 годзе, было запісана: «…Мы лічым відавочным наступныя ісціны: усе людзі створаныя роўнымі і ўсе яны надзеленыя творцам некаторымі неадлучнымі правамі, да ліку якіх належыць жыццё, свабода і імкненне да шчасця. Для забяспечання гэтых правоў усталяваныя сярод людзей урады, якія надзяляюцца справядлівай уладаю са згоды грамадзян. Калі ж дадзеная форма кіравання становіцца пагібельнаю для іх мэтаў, то народ мае права змяніць або скасаваць яе і ўстанавіць новы ўрад, заснаваны на такіх прынцыпах і з такой арганізацыяй улады, якія, на думку гэтага народа, больш за ўсё могуць спрыяць яго бяспецы і шчасцю». Гэтыя ідэі Амэрыканскай рэвалюцыі супадалі з поглядамі Касцюшкі, пра што можна меркаваць па яго дзейнасці на Бацькаўшчыне, куды ён вярнуўся ў 1784 годзе.

[4] Избранные произведения прогрессивных польских мыслителей. М., 1956. Т.1. С.537.

## Зноў на Радзіме

### Пяць гадоў у Сяхновічах

Вяртанне Касцюшкі ў родныя мясціны было бязрадасным. Маёнтак у Сяхновічах быў абцяжараны даўгамі з прычыны дрэннага кіравання і безгаспадарчасці брата. Месца ў войску для аднаго з сама адукаваных і з багатым досведам вядзення ваенных дзеянняў генерала не знайшлося. У краіне панавала бязладдзе і свавольства магнатаў, а асноўная частка насельніцтва – сялянства знаходзілася ў бяспраўным становішчы. Застаўшыся без справаў, баявы генерал на працягу пяці гадоў вымушаны быў займацца сельскай гаспадаркай у Сяхновічах.

### Чатырохгадовы Сойм Рэчы Паспалітай

У апошняй чвэрці XVIII стагоддзя ў Рэчы Паспалітай узмацніўся працэс раскладання прыгонніцтва і актывізавалася дзейнасць прыхільнікаў правядзення рэформаў дзяржаўнага ладу. Атрымлівалі распаўсюджанне працы С. Сташыца, Г. Калантая, К. Нарбута, І.Храптовіча ды іншых ідэолагаў правядзення рэформаў. У 1788 годзе сабраўся Чатырохгадовы Сойм, які пачаў праводзіць рэформы. Спачатку ў гэты Сойм было абрана 177 дэпутатаў, пасля дадатковых выбараў у 1790 годзе іх колькасць павялічылася на 182 дэпутаты, з якіх 112 былі прыхільнікамі рэформаў.

### Служба ў польскай арміі

Пастановай Сойму войска павінна было павялічыцца да 100 000 жаўнераў і афіцэраў – прыкладна ў пяць разоў параўнальна з ранейшай колькасцю. У сувязі з гэтым, а таксама па рэкамендацыі Берасцейскага сойміка ў 1789 годзе Касцюшка атрымаў пасаду камандзіра брыгады ў польскай арміі, хоць жадаў ён служыць толькі ў войску Вялікага Княства Літоўскага.

У лісце да генерала К. Несялоўскага 7 лютага 1790

года ён прасіў вырваць яго з польскай арміі і вярнуць у Вялікае Княства Літоўскае: «Хіба Вы адмаўляецеся ад мяне і лічыце нядольным служыць Вам? Кім жа я з'яўляюся? Хіба ж я не ліцьвін, Ваш зямляк, Вамі абраны? Каму павінны дзякаваць <за рэкамендацыю Берасцейскага сойміка>, калі не Вам? Каго павінны абараняць, калі не Вас і сябе самога? Калі гэта Вас не кране для ўнясення прапановы пра мяне на Сойме, каб вярнуўся, то я сам буду вымушаны, бачыць Бог, што-небудзь кепскае сабе ўчыніць! Таму што злосць мяне бярэ: каб з Літвы ў Кароне (Польшчы) служыў, калі вы не маеце і трох генералаў. Калі вас вешаць на вяроўцы будуць гвалтаўнікі, тады толькі адумаецеся і пра сябе пачняце клапаціцца…Заклінаю ўсім, што ёсць у жыцці наймілейшага, жоначкай і дзеткамі… каб схацеў, яснавяльможны пане дабрадзею, вырваць мяне з такога непрыемнага месца… Бачыць Бог: слова не маю да каго сказаць – і добра, бо з валамі ніколі не размаўляў. Што за гасконцы[5]! Край прыгожы, і ён павінны б быць прызначаны для пачцівых і гаспадарлівых ліцьвіноў, а не для іх, гультаёў і нядбальцаў»[6]. На радзіме пра Касцюшку не забываліся. 13 лютага 1790 года берасцейскі гаспадарчы соймік абавязаў паслоў ад ваяводства на Вальным Сойме ў Варшаве К. Сапегу і Т. Матушэвіча прыкласці ўсе намаганні, каб «амэрыканскі генерал» абавязкова «мог быць у сваім рангу да войска Літоўскага пераведзены»[7]. Аднак, нягледзячы на ўсе старанні, здзейсніць сваё жаданне Касцюшку не ўдалося.

Асабістае жыццё ў Касцюшкі складвалася няўдала. Знаходзячыся ў польскім войску, будучы камандзірам брыгады, размешчанай у Заходняй Украіне, ён сустрэў дзяўчыну, якую пакахаў і якая адказала яму ўзаемнасцю, нягледзячы на тое што ён быў старэйшы за яе на 27 гадоў. Але бацька не дазволіў ёй выйсці замуж, бо лічыў, што ў абранніка няма добрага маёнтка (паводле іншых крыніцаў,

---

[5] У тыя часы слова «гасконец» (г. зн. жыхар Гасконі, правінцыі Францыі) было сінонімам самахвальства, пыхі, ганарлівасці. Гэтак наш зямляк характарызаваў жыхароў тых мясцінаў у Польшчы, дзе ён служыў у войску.

[6] Korzon T. Kościuszko, biografia z dokumentów wysnuta. Kraków; Warszawa, 1894. S.206.

[7] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, фонд 1705, вопіс 1, справа 71, аркуш 896.

дзеля таго, што ў яго закахалася маці нявесты).

14 ліпеня 1789 года пачалася Вялікая французская рэвалюцыя, якая прыметна паўплывала на многія эўрапейскія народы, у тым ліку і на народы Рэчы Паспалітай. Актывізавалася дзейнасць дробнай гарадской буржуазіі ды інтэлігенцыі, пачалі ўзнікаць палітычныя арганізацыі. Сойм прыняў шэраг важных законаў, накіраваных на ўмацаванне органаў дзяржаўнай улады.

У студзені 1791 года быў прыняты новы закон аб кардынальных правах, які прадугледжваў прызнанне панавальнага становішча за каталіцкаю царквою, непарушнасць хаўрусу Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага, незалежнасць і суверэннасць Рэчы Паспалітай, свабоду слова і друку, затым у сакавіку – закон аб сойміках, паводле якога беззямельная шляхта была пазбаўленая выбарчых правоў, у красавіку – закон аб гарадах. За месцічамі было прызнанае права асабістай недатыкальнасці, права набыцця маёнткаў і пашыраліся іншыя правы. Вызначаліся розныя выпадкі прызнання за імі шляхоцкай годнасці, уносіліся змены ў парадак разгляду крымінальных справаў, па якіх прадугледжвалася пакаранне смерцю.

## Канстытуцыя 3 траўня 1791 года

Законы аб сойміках і аб гарадах з'явіліся пачаткам буржуазных рэформаў у Рэчы Паспалітай. Завяршэннем іх з'явілася канстытуцыя, прынятая 3 траўня 1791 года. Гэтым законам усталёўваліся новыя прынцыпы арганізацыі найвышэйшых органаў дзяржаўнай улады і кіравання, якія мусілі будавацца паводле прынцыпу падзелу ўлады. Каталіцкая рэлігія абвяшчалася панавальнай, але адначасова абвяшчалася і свабода іншых рэлігійных абрадаў, гарантаваліся правы і прывілеі заможных шляхты і мяшчанаў, захоўвалася залежнасць сялян ад памешчыкаў, але абвяшчалася апека права і ўрада над сялянамі.

Дзяржаўны лад вызначаўся як канстытуцыйная манархія, улада караля была абмежаваная Соймам. Яму належала заканадаўчая ўлада, і складаўся ён з палаты

дэпутатаў і сената, у які ўваходзілі каталіцкія біскупы[8], ваяводы, кашталяны і некаторыя вышэйшыя службовыя асобы – усяго 132 чалавекі, а ў палату дэпутатаў – 204 чалавекі. Акрамя таго, у Сойм з дарадчым голасам дапускаліся прадстаўнікі ад мяшчанаў.

Сама істотным новаўвядзеннем паводле канстытуцыі былі адмена «лібэрум вета» і стварэнне ўрада для ўсёй Рэчы Паспалітай (асобныя дзяржаўныя структуры Вялікага Княства Літоўскага скасоўваліся). Урад называўся «Вартавы правоў» і складаўся з караля як старшыні ўрада, кіраўніка каталіцкага духавенства – прымаса і пяці міністраў: міністра паліцыі, міністра пячаткі (нутраных справаў), вайсковага міністра, міністра фінансаў і міністра замежных справаў. На паседжаннях урада маглі прысутнічаць з дарадчым голасам спадкаемца трона і старшыня (маршалак) Сойму. Міністраў прызначаў і здымаў кароль. Прадугледжвалася стварэнне судоў, незалежных ад адміністрацыі, і выданне новых грамадзянскага і крымінальнага кодэксаў.

Канстытуцыя 3 траўня з'яўлялася вынікам кампрамісу шляхты з маладой буржуазіяй. Прагрэсіўныя дзеячы Рэчы Паспалітай бачылі ў ёй толькі пачатак і падрыхтоўку да рэвалюцыйных пераўтварэнняў і поўнасцю яе падтрымлівалі. Прыхільнікі старых парадкаў разглядалі яе як ужо здзейсненую рэвалюцыю, выступілі супраць канстытуцыі і, учыніўшы акт дзяржаўнай здрады, звярнуліся па дапамогу да суседніх дзяржаваў.

Тадэвуш Касцюшка як перакананы рэспубліканец, калі паўстала пытанне аб прысязе на вернасць Канстытуцыі 3 траўня, без ваганняў прыняў такую прысягу і распарадзіўся аб яе прыняцці падначаленымі яму афіцэрамі, нягледзячы на тое што канстытуцыя прадугледжвала захаванне манархіі.

Пасля прыняцця Канстытуцыі 3 траўня Чатырохгадовым Соймам 29 чэрвеня 1791 года былі створаныя дзве дэпутацкія камісіі: Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага,

---

[8] Згодна з пастановай Сойму ў 1790 годзе ў склад Сената быў уведзены вуніяцкі мітрапаліт Растоцкі. Гэта адбылося ўпершыню з моманту прыняцця вуніі ў 1596 годзе.

якія павінны былі падрыхтаваць праект праўнай рэформы, выпрацаваць асновы кадыфікацыі крымінальнага і грамадзянскага права. Ідэолаг радыкальнага блока Гуга Калантай прапанаваў у аснову новага заканадаўства пакласці Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588 года, аб якім «немагчыма прыгадаць без вялікага захаплення… Літоўскі статут робіць гонар чалавечаму розуму…, складзены тах разумна, асабліва ў дачыненні да ступеняў пакарання, што яго можна лічыць сама дасканалай кнігай законаў ва ўсёй Эўропе, калі не браць пад увагу некаторых хібаў, што ўзніклі пад націскам грамадскай думкі той эпохі, і залішняй строгасці ў пакараннях, уласцівай таму веку».

Асноўная ідэя Статута – зацверджанне праўнага парадку, пры якім усе дзяржаўныя органы і службовыя асобы абавязаны дзейнічаць толькі ў адпаведнасці з правам. Таму Касцюшка, які вырас у сям'і, дзе прадзед і дзед былі судовымі чыноўнікамі, з дзяцінства выхоўваўся на павазе да права і асабліва да Статута, што заставаўся дзейным законам на тэрыторыі Беларусі да 1840 года.

## Таргавіцкая канфедэрацыя

У 1792 годзе ўскладнілася міжнароднае становішча Рэчы Паспалітай. Прусія, адыгрываючы з 1790 да 1792 года ролю хаўрусніцы Рэчы Паспалітай, імкнулася пасварыць яе з Расеяй, а затым пайшла на змову з царызмам. У пачатку 1792 года актывізавалася дзейнасць рэакцыйных магнатаў і вярхоў каталіцкага духавенства, так званай старашляхоцкай партыі, супраць прагрэсіўных законаў, прынятых у 1791 годзе. Пасля перамоваў у Пецярбурзе з Кацярынай II, заручыўшыся яе абяцаннем падтрымаць іх бунт, правадары старашляхоцкай партыі 27 красавіка 1792 года падпісалі ў Пецярбурзе акт канфедэрацыі, які затым быў зачытаны ва ўкраінскім мястэчку Таргавіца пад фальшывай датай 14 траўня.

Акт аб'яўляў незаконнай дзейнасць Сойму, які нібыта «парушыў кардынальныя правы, адмяніў усе шляхоцкія вольнасці, а 3 траўня, учыніўшы рэвалюцыйную змову,

устанавіў новую форму ўлады пры дапамозе месцічаў, жаўнераў, уланаў... Рэспубліку ператварыў у манархію, беззямельную шляхту ад роўнасці і свабод адхіліў»[9]. Далей гаварылася, што канфедэрацыя ўтвораная ў імя абароны каталіцкай рэлігіі, захавання цэласці межаў Рэчы Паспалітай і захавання старых вольнасцяў шляхты. Не маючы шырокай падтрымкі ўнутры дзяржавы, таргавічане звярнуліся да царскага ўрада, які 18 траўня 1792 года накіраваў 100-тысячную армію ім на дапамогу.

## Ваенныя дзеянні

Уступленне царскіх войскаў у вайну супраць законнага ўрада было яўнай агрэсіяй. На абарону канстытуцыі выступілі слабыя і раз'яднаныя часціны войска Рэчы Паспалітай. Адна з першых бітваў, у якой вызначылася дывізія пад камандаваннем Касцюшкі, адбылася каля вёскі Дубенкі на Заходнім Бугу. У гэтай бітве Касцюшка, які меў пад сваім камандаваннем блізу 5 тысяч салдат і афіцэраў, стрымаў націск прыкладна 20 тысяч царскіх войскаў і даў магчымасць усёй паўднёвай арміі пад камандаваннем князя Ю. Панятоўскага адысці на новыя пазіцыі. Аднак лёс гэтай кампаніі быў перадвызначаны, бо многія магнаты і шляхта дый сам кароль, здзейсніўшы акт дзяржаўнай здрады, перайшлі на бок таргавічанаў. Варшава была занятая царскімі войскамі.

## Выхад з войска

Нягледзячы на тое што Касцюшка за ваенныя заслугі ў часе кампаніі 1792 года быў узнагароджаны ордэнам «Віртуці Мілітары» і яму было нададзенае званне генерал-лейтэнанта, ён 30 ліпеня 1792 года ў знак пратэсту супраць змовы караля з таргавічанамі падаў у адстаўку і выехаў за мяжу. 26 жніўня 1792 года пастановай Заканадаўчага сходу Францыі Касцюшка атрымаў годнасць

---

[9] Historia Polski. Warszawa, 1958. T.2, cz.1. S.298.

ганаровага грамадзяніна гэтай дзяржавы.

## Гарадзенскі Сойм

Трыумф таргавічанаў быў нядоўгі. Выклікаўшы ваенны разгром Рэчы Паспалітай, яны садзейнічалі і яе другому падзелу, бо ў студзені 1793 года Прусія дамовілася з Расеяй аб адарванні ад Рэчы Паспалітай часткі тэрыторыі. Да Расеі адышла частка Беларусі і Заходняй Украіны, а да Прусіі – спрадвечна польскія землі з гарадамі Торунь, Гданьск, Познань. Сойм Рэчы Паспалітай, які сабраўся 17 чэрвеня 1793 года ў Горадні, прызнаў гэты падзел. На Гарадзенскім Сойме было абвешчана аб роспуску таргавіцкай і стварэнні соймавай гарадзенскай канфедэрацыі. Гарадзенскім Соймам была адмененая Канстытуцыя 3 траўня і прынята новая. У адпаведнасці з Канстытуцыяй 1793 года аднаўлялася Неадменная рада; аднаўлялася выбіральнасць каралёў; найвышэйшым заканадаўчым органам краіны заставаўся Сойм, які мусіў склікацца кожныя чатыры гады на восем тыдняў; пастановы ў Сойме прымаліся бальшынёй галасоў; каралю давалася права вета на соймавыя пастановы, якія датычаць асноўных законаў. Але нават і гэтая канстытуцыя заставалася на паперы, бо Рэч Паспалітая страчвала сваю незалежнасць.

## На чале паўстання

### Падрыхтоўка паўстання

Няспыннае ўмяшанне суседніх манархічных рэжымаў у нутраныя справы Рэчы Паспалітай і бяссілле «сваіх» дзяржаўных органаў выклікалі пратэст і незадавальненне шырокіх пластоў народа і асабліва прагрэсіўнай шляхты, прадстаўнікі якой пачалі падрыхтоўку да паўстання. Актыўны ўдзел у падрыхтоўцы браў Тадэвуш Касцюшка. Ён накіраваўся ў Парыж, дзе вёў перамовы з міністрам замежных справаў і перадаў яму мемарыял пра задачы рэвалюцыі ў Рэчы Паспалітай. У ім гаварылася пра неабходнасць скасавання каралеўскай улады і сената, найвышэйшага святарства, пра свабоду набыцця зямельнай уласнасці, пра выбарчыя правы для ўсіх землеўласнікаў і асобаў, што плоцяць падаткі, пра ліквідацыю прыгоннай залежнасці сялянаў, пра свабоду і роўнасць для ўсіх.

### Памяркоўныя і радыкалы

Мемарыял абвяшчаў тыповыя мэты буржуазнай рэвалюцыі. Але надзеі на падтрымку Францыі не спраўдзіліся і Касцюшка вымушаны быў вярнуцца, не атрымаўшы ніякай канкрэтнай дапамогі. Знаходзячыся на эміграцыі ў Ляйпцыгу, Касцюшка падтрымліваў сувязь з рознымі патрыятычнымі дзеячамі, якія рыхтаваліся да паўстання. Сярод іх пэўна вызначыліся дзве плыні – памяркоўных, якія жадалі захаваць становішча, што існавала да ўварвання замежных войскаў, і больш радыкальных, якія імкнуліся далучыць да паўстання шырокія пласты месцічаў і сялянаў. Да гэтага кірунку належаў і Касцюшка, які заяўляў: «Ваяваць толькі за шляхту не буду. Жадаю свабоды для ўсяго народа і толькі для яго гатовы ахвяравацца жыццём»[10].

[10] Kopczewski J. S. Tadeusz Kościuszko. Warszawa, 1971. S.61.

## Пачатак паўстання

У 1794 годзе актывізавалася падрыхтоўка паўстання, якое павінна было пачацца адначасова ў Кракаве, Варшаве, Вільні. Падрыхтоўкай паўстання кіравала група патрыётаў, вымушаных выехаць у Ляйпцыг і Дрэздэн. Сярод іх, акрамя Т. Касцюшкі, былі Г. Калантай, І.Патоцкі ды інш. На тэрыторыі Рэчы Паспалітай дзейнічалі таемныя хаўрусы і таварыствы прыхільнікаў паўстання на чале з І.Дзялынскім, К. Прозарам і інш. Касцюшка разумеў, што пры слабасці гарадской буржуазіі і забітасці паднявольных сялян на барацьбу трэба было ўзняць і прагрэсіўна настроеную шляхту. Аднак гэта вяло да кампрамісу і ў пэўнай ступені адштурхоўвала сялян ад актыўнай барацьбы, бо пераважная бальшыня шляхты не жадала сацыяльнай рэвалюцыі, а імкнулася толькі да аднаўлення парадкаў у адпаведнасці з Канстытуцыяй 3 траўня. Гэтая дваістасць становішча асабліва выразна выявілася на пачатку паўстання.

## Кракаўскі Акт

24 сакавіка 1794 года ў Кракаве выбухнула паўстанне, у якім узялі ўдзел шляхта, мяшчане і некаторая частка сялянаў. На чале яго стаў генерал-лейтэнант Андрэй Тадэвуш Банавентура Касцюшка, абвешчаны найвышэйшым і адзіным начальнікам узброеных сілаў. Гэтага ж дня быў абвешчаны Акт паўстання грамадзян, жыхароў Кракаўскага ваяводства, і Касцюшка прынёс прысягу, у якой абавязаўся даверанай яму ўлады не ўжываць у чыіх-небудзь асабістых інтарэсах, а толькі для абароны цэласці межаў, усталявання самаўладдзя народа і ўсеагульнай свабоды.

Акт паўстання пачынаўся з выкрыцця подласці, ашуканства і падступнасці царыцы Кацярыны II і прускага караля Фрыдрыха Вільгельма. У Акце гаварылася: «Няма такой хлусні, прытворства і падману, якімі не зганьбілі б сябе гэтыя два ўрады… Пад выдуманымі прычынамі, хлуслівымі і бессэнсоўнымі, карыстацца якімі пасуе адным

толькі тыранам, дагаджаючы на самой справе толькі сваёй ненажэрнай сквапнасці і жаданню распаўсюдзіць панаванне тыраніі на суседнія народы… Царыца, утойваючы свае далейшыя намеры, небяспечныя для эўрапейскіх дзяржаваў, прысвяціла сябе варварскай і ненажэрнай помсце. Яна топча святыя правы свабоды, бяспекі, недатыкальнасці асобы і маёмасці грамадзян… Толькі здраднікі Айчыны карыстаюцца яе прыхільнасцю і могуць беспакарана чыніць свае злачынствы».

У Акце паўстання Касцюшка правільна адзначыў, што галоўнай мэтай Кацярыны II і Фрыдрыха Вільгельма было жаданне «распаўсюдзіць панаванне тыраніі» і задушэнне свабоды на суседнія народы. Акт паўстання яшчэ раз выкрыў перад усім светам паказны лібералізм Кацярыны II.

Палітычнае кіраўніцтва паўстаннем у адпаведнасці з Актам ускладалася на Найвышэйшую Нацыянальную Раду. У якасці надзвычайных мясцовых органаў прадугледжвалася стварэнне «парадкавых камісіяў» у ваяводствах і паветах, якія ў сваю чаргу стваралі дазорныя ўправы. Кожная дазорная ўправа ахоплівала 1000–1200 сялянскіх гаспадарак. Ствараліся новыя рэвалюцыйныя суды, якія павінны былі разглядаць крымінальныя справы аб злачынствах, накіраваных супраць паўстання.

Новыя органы ўлады, камісіі, управы і суды не знішчылі старога дзяржаўнага апарату, засталася і манархія. Пры канцы траўня была створаная Найвышэйшая Нацыянальная Рада. У яе склад уваходзілі 8 радцаў і 32 сябры Рады (наместнікі радцаў), але галоўная роля належала Касцюшку як начальніку ўзброеных сілаў. (Адным з сябраў Рады быў Сава Пальмоўскі, ігумен праваслаўнага Бельска-Падляшскага манастыра, старшыня Пінскай кангрэгацыі – часовай праваслаўнай герархіі ў Вялікім Княстве і Польшчы, незалежнай ад пецярбургскага Сінода, якая была створаная ў 1791 годзе і зацверджаная Чатырохгадовым Соймам у траўні 1792 года.) У Радзе ўвесь час ішла барацьба паміж памяркоўнымі рэфарматарамі і рэвалюцыйна настроенымі дзеячамі («якабінцамі»), паслядоўнікамі французскіх рэвалюцыянераў.

Выданне Акта паўстання мела выключна важнае значэнне для мабілізацыі ўсіх прагрэсіўных сілаў на барацьбу як з нутраной рэакцыяй, так і з замежнымі захопнікамі. Акт абавязваў Касцюшку і Найвышэйшую Нацыянальную Раду выпускаць як мага часцей пракламацыі і звароты да народа, паведамляць яму аб сапраўдным становішчы справаў. Гэтым былі засведчаныя дэмакратычныя прынцыпы паўстання і імкненне ператварыць яго ў агульнанароднае.

## Першыя адозвы Касцюшкі

У першы ж дзень паўстання Касцюшка звярнуўся з адозвамі «Да войска», «Да грамадзянаў», «Да святарства», «Да жанчын». Кожная з гэтых адозваў глыбока эмацыйна і пераканаўча заклікала стаць на абарону свабоды і Айчыны. Так, у адозве «Да войска» гаварылася: «Будзем жа адзіным калектывам з грамадзянамі, згуртуемся шчыльней, злучым сэрцы і сродкі ўсіх жыхароў нашай зямлі… Калегі! Ідзіце са мной! Чакае Вас слава і асалода задавальнення быць вызвольнікамі Айчыны… Бяру разам з Вамі лозунг «Смерць або перамога!» У звароце «Да грамадзянаў» Касцюшка адзначаў, што, каб зрабіць першы крок да вызвалення, неабходна адважыцца быць свабодным, а каб атрымаць перамогу, трэба быць упэўненым ва ўласнай сіле. У звароце да святарства абвяшчалася свабода для ўсіх веравызнанняў. (У звароце да праваслаўных святароў 7 траўня 1794 года Касцюшка назваў іх «нявольнікамі маскоўскімі», паабяцаў, што пры перамозе паўстання яны стануць «святарамі шанаванымі». Было абвешчана аднаўленне дзейнасці незалежнай, па сутнасці аўтакефальнай, праваслаўнай царквы з уласным мітрапалітам і епіскапамі, падначаленымі канстанцінопальскаму патрыярху.) Аднак гэта не магло задаволіць каталіцкае святарства, якое патрабавала сабе выключных прывілеяў і пераваг. У звароце «Да жанчын» Касцюшка заклікаў іх актыўна падтрымліваць сваіх братоў, сыноў і мужоў, якія сталі на шлях змагання за волю.

Энергічная ідэалагічная падрыхтоўка паўстання і арганізацыйная праца па мабілізацыі розных станаў грамадства на барацьбу за свабоду напачатку мела некаторы поспех.

Асноўнымі сіламі нацыянальна-вызвольнага руху былі вайскоўцы, сярэдняя і малазямельная шляхта, мяшчанства і сяляне. Аднак палітычнае кіраўніцтва паўстаннем у значнай ступені знаходзілася ў руках прадстаўнікоў кансерватыўнага шляхоцкага блока, які імкнуўся не дапусціць сацыяльнай рэвалюцыі і надаць паўстанню выключна прапольскі нацыянальна-вызвольны характар, што адразу абмяжоўвала ўдзел у ім насельніцтва Беларусі.

Каб прыцягнуць сялян да паўстання, Касцюшка лічыў неабходным адмену прыгоннага права, таму Канстытуцыя 3 траўня, якая захоўвала няроўнасць станаў і прыгонную залежнасць сялян, не была яго ідэалам, у сувязі з чым Акт паўстання не закранаў пытання аб аднаўленні канстытуцыі. Канчатковае вызначэнне дзяржаўнага і грамадскага ладу Акт паўстання адносіў да часу сканчэння рэвалюцыйнай вайны.

### Рацлавіцы

На пачатку красавіка 1794 года Касцюшка меў у сваім распараджэнні 4100 жаўнераў і 2000 сялян з косамі і пікамі. 4 красавіка адбылася першая буйная бітва паміж паўстанцкай арміяй і царскімі войскамі пры вёсцы Рацлавіцы пад Кракавам, якая скончылася перамогай паўстанцаў. Перамога пад Рацлавіцамі мела важнае значэнне для далейшага развіцця паўстання, якое пашыралася на Сандамірскае і Люблінскае ваяводствы і Холмскую зямлю. 17–18 красавіка паўсталі гарадскія масы ў Варшаве. 19 красавіка быў абвешчаны Акт Мазавецкага ваяводства аб яго далучэнні да паўстання пад кіраўніцтвам Касцюшкі. Ад самага пачатку паўстання ў Варшаве пачалася барацьба за ўладу ў горадзе. Была створана Часовая Замяшчальная Рада. На чале Рады стаў прэзідэнт Варшавы Закшэўскі, ваенным камендантам быў прызначаны прыхільнік каралеў-

скай улады генерал Станіслаў Макраноўскі, які спрабаваў засцерагчы ад пакарання здраднікаў-таргавічанаў. Часовая Замяшчальная Рада з першых жа дзён паўстання ў Варшаве не карысталася даверам у мяшчанства і асабліва ў рэвалюцыйна настроеных «якабінцаў». (Сам Касцюшка спачатку насцярожана паставіўся да варшаўскай Рады, утварэнне якой не прадугледжвалася Кракаўскім Актам. Галоўную небяспеку ён бачыў у непатрэбнай дэцэнтралізацыі паўстання.)

**Чаму Касцюшка не хацеў змагацца «толькі за шляхту»?**

Чаму Касцюшка не падтрымаў сваіх найбольш рэвалюцыйных прыхільнікаў? Чаму адразу ж не адмяніў прыгоннага права і не адхіліў ад палітычнага кіраўніцтва паўстаннем прадстаўнікоў кансерватыўнай шляхты? Ён не зрабіў гэтага, бо ўлічваў рэальныя стасункі сілаў і імкнуўся прыцягнуць на бок паўстання не толькі шырокія пласты працоўнага сялянства і гарадскіх нізоў, але вымушаны быў таксама лічыцца з тым, што значную частку ўзброеных сілаў складала шляхта, а гарадскія рамеснікі і дробная буржуазія былі невялікай часткай насельніцтва. Прыгонныя сяляне не маглі быць галоўнай сілай паўстання. Таму Касцюшка быў змушаны лавіраваць паміж правымі рэфарматарамі і левымі рэвалюцыянерамі, да таго ж павінны быў улічваць, што для барацьбы супраць нутраной контррэвалюцыі і замежных інтэрвентаў неабходна было згуртаванне ўсіх, хто мог падтрымаць паўстанне.

**Паланецкі ўніверсал**

7 траўня 1794 года Касцюшка выдаў Паланецкі ўніверсал, якім гарантавалася апека ўрада над сялянамі; сяляне абвяшчаліся асабіста вольнымі, г. зн. адмянялася прыгоннае права, але без зямлі, пайсці ад памешчыка селянін мог толькі пры ўмове выплаты даўгоў і дзяржаўных падаткаў, а таксама паставіўшы ў вядомасць Камісію ўправы, куды ён перасяляецца; вызначаліся пэўныя льготы

ў адбыванні паншчыны. Спецыяльнымі артыкуламі ўніверсала Касцюшка папярэджваў, што парушэнне гэтых пастановаў памешчыкамі будзе карацца судом як працідзеянне мэтам паўстання.

Сяляне ў сваю чаргу заклікаліся старанна адбываць зменшаныя дні паншчыны, слухацца свайго начальства, дбаць пра гаспадарку, не павінны былі адмаўляцца ад найму да памешчыкаў за адпаведную плату. Далей ва ўніверсале гаварылася: «Калі якія-небудзь нягоднікі, выкарыстоўваючы на шкоду дабрыню і справядлівасць урада, будуць адцягваць просты народ ад працы, падбухторваць яго супраць памешчыкаў, адгаворваць ад абароны Айчыны, то камісіі ўправы павінны загадаць схапіць такіх злачынцаў і аддаць іх крымінальнаму суду». Святарству даручалася растлумачваць гэтае распараджэнне з амбонаў у касцёлах і цэрквах на працягу чатырох тыдняў. Камісіі ўправы павінны былі прызначыць асобаў, якія б гучна чыталі распараджэнне ў вёсках і прыходах, заклікаючы сялянаў да паўстання.

Паланецкі ўніверсал не адмяніў поўнасцю прыгоннага права і не ліквідаваў феадальнай эксплуатацыі, але дазваляў сялянам ісці ад памешчыкаў, што было таксама ў інтарэсах буржуазіі, якая зараджалася. Гэты акт быў безумоўна прагрэсіўны, хоць і палавіністы. Ён аслабляў эканамічны стан маёнткаў, абмяжоўваў паншчыну і паніжаў значэнне шляхоцкіх прывілеяў. Таму феадалы ўсяляк затрымлівалі абвяшчэнне ўніверсала і, баючыся сацыяльнай рэвалюцыі, часта ішлі на змову з замежнымі войскамі. Многія палажэнні ўніверсала не выконваліся на месцах і засталіся толькі на паперы. Супраць ажыццяўлення Паланецкага ўніверсала выступілі і вярхі каталіцкага святарства.

Заклікі Касцюшкі да простага народа часта выклікалі недавер сялянаў і сабатаж памешчыкаў. Ю. Нямцэвіч, паплечнік Касцюшкі, у сваіх успамінах пісаў наконт гэтага: «Шляхта, якая прывыкла без перашкодаў карыстацца маёмасцю сваіх сялян, супраціўлялася выкананню загада Начальніка (Касцюшкі) высылаць пятага селяніна з касою ў

армію. Нават сельскі народ, які так доўга жыў у няволі, у бальшыні не прадбачыў лепшай долі, не зазнаўшы яе, быў абыякавы. Дарэмна Касцюшка сваім універсалам з-пад Паланца 7 траўня 1794 года абвясціў вясковы люд свабодным, аб'яўляў яму волю. Універсалы гэтыя або не дайшлі, або ім не верылі»[11].

Гэтая характарыстыка, дадзеная Нямцэвічам стаўленню абшарнікаў і прыгонных сялянаў да паўстання, адлюстроўвала сапраўднае становішча і ў значнай меры тлумачыла пазнейшыя няўдачы паўстання. У сялян цягам стагоддзяў бізуном і прымусам замацоўвалася рабская псіхалогія. Яны, цалкам залежныя ад сваіх паноў, не былі гатовыя да актыўных дзеянняў у якасці сведамых барацьбітоў за свае правы, за сваю волю. Сведамасць селяніна далёка не заўсёды была падрыхтаванай да асэнсавання заклiку бараніць Бацькаўшчыну, у якой яго лічылі «быдлам» і «хамам». Усё гэта ўлічваў Касцюшка і ў кожным яго звароце да народа стараўся абудзіць іх сведамую актыўнасць, умацаваць веру ў перамогу. Пасля бітвы пад Рацлавіцамі, у якой удзельнічалі 2000 апалчэнцаў з сялян, Касцюшка ўзнагародзіў тых, хто найбольш вызначыўся, а Войцэха Барташа ўзвёў у чын афіцэра і назваў яго Барташам Главацкім, тым сама надаўшы яму шляхоцкую годнасць. Сам жа ён хадзіў у сялянскай світцы. Усё гэта спрыяла павышэнню аўтарытэту Касцюшкі сярод сялянства.

Усе, хто асабіста быў знаёмы з Касцюшкам, падкрэслівалі яго вайсковы талент, высокую адукаванасць, нястомную энергію і прастату. Так, падскарбі Вялікага Княства Літоўскага, удзельнік паўстання, кампазітар Міхал Клеафас Агінскі пісаў, што Тадэвуш Касцюшка «карыстаўся вялікай пашанай усёй Эўропы, быў гразой для ворагаў і боствам для народа; узвышаны да рангу Начальніка, не ведаў іншага гонару як служыць Айчыне і змагацца за яе, заўсёды сціпла сябе паводзіў..., не насіў ніякіх знакаў вышэйшай улады, хадзіў у сурдуце з простага шэрага сукна

---

[11] Niemcewicz J. Pamiętniki czasów moich. Paryż, 1848. S.207.

і сталаваўся так, як звычайны афіцэр». Гэтая характарыстыка, дадзеная земляком, не выклікае сумневу ў яе аб'ектыўнасці, бо пацвярджаецца іншымі дакументамі.

Успрыняўшы вучэнне перадавых французскіх пісьменнікаў, філосафаў і публіцыстаў, а таксама прагрэсіўных амэрыканскіх буржуазных дзеячоў, Касцюшка выпрацаваў самастойную дзяржаўна-праўную канцэпцыю палітычнага і грамадскага развіцця Рэчы Паспалітай. Ідэалам грамадскага ладу ён лічыў грамадства, якое складаецца з вольных сялянаў – уласнікаў зямлі, рамеснікаў, купцоў пры захаванні памешчыцкага землеўладання, заснаванага на вольным найме рабочай сілы. Найлепшую форму дзяржаўнага кіравання ён бачыў у рэспубліцы, тэарэтычныя асновы якой спрабаваў выкласці ў Паланецкім універсале. Аднак ажыццявіць гэтыя ідэі яму не ўдалося.

## За волю Вялікага Княства

## Да аднаўлення Айчыны

Сакавіцкія падзеі ў Кракаве неўзабаве знайшлі свой працяг на радзіме Касцюшкі. Ён сам і яго бліжэйшыя паплечнікі вельмі спадзяваліся на дапамогу з Вялікага Княства Літоўскага. Тут яшчэ з другой паловы 1793 года ў асяроддзі патрыятычна настроенага афіцэрства, мясцовай шляхты ды святарства пачалася падрыхтоўчая праца да будучага паўстання. У Вільні, Горадні, Наваградку, Берасці, ваколіцах Браслава, Ашмяны, Смаргоні, Хвойнікаў, Пінска і Мазыра яны складалі спісы аднадумцаў, збіралі сродкі і зброю, знаёмілі надзейных людзей з першымі таемнымі пасланнямі Касцюшкі.

Дзеля ўздыму патрыятычнага духу была створаная і шырока распаўсюджвалася «Песня паўстанцаў»:

Помнім добра, што рабілі,
Як нас дзёрлі, як нас білі.
Докуль будзем так маўчаці?
Годзе нам сядзець у хаце!
Нашто землю нам забралі?
Пашто ў путы закавалі?
Дочкі, жонкі нам гвалцілі.
Трэ', каб мы ім заплацілі!
Коней нам пазаяжджалі,
Што хацелі, то і бралі.
Пойдзем жыва да Касьцюшкі,
Рубаць будзем маскалюшкі!

У Беларусі гэтую працу напачатку ўзначальваў экс-абозны Вялікага Княства Кароль Прозар. Дапамагалі яму Канстанцін Ельскі, былы надворны маршалак Станіслаў Салтан, віленскі святар Міхаіл Богуш, экс-стражнік літоўскі Ян Аскерка ды іншыя. Яшчэ ў лістападзе 1793 года ў Мазырскім павеце пачынае хадзіць па руках пісьмовы ўніверсал ад Касцюшкі з заклікам, каб «збіраліся грамадзяне

да аднаўлення Айчыны».

Весткі аб неспакоі «на Літве» сталі даходзіць да расейскага пасла ў Варшаве. Таму ён на пачатку 1794 года з мэтаю высвятлення сітуацыі накіраваў туды «надзейнага чалавека з палякаў». Прывезеныя звесткі пацвердзілі здагадкі пра існаванне асяродка бунту ў Беларусі. Непакой акупантаў яшчэ болей узрос, калі пачалося паўстанне ў Кракаве. Іх галоўны памагаты ў Вялікім Княстве гетман Сымон Касакоўскі дае загад арыштаваць западозраных у змове ў Вільні, Навааградку і Горадні.

Усё ж галоўны, вайсковы, асяродак па падрыхтоўцы паўстання, які на пачатку 1794 года ўзначальваў у Вільні палкоўнік «літоўскага корпусу інжынераў» Якуб Ясінскі, застаўся нераскрыты. Але ад сярэдзіны красавіка яму і ягоным сябрам таксама пачынае пагражаць арышт. Больш марудзіць з пачаткам паўстання было нельга.

## Вызваленне Вільні

Уначы з 22 на 23 красавіка паўстала Вільня. А палове першай па стрэле гарматы з віленскага арсенала рушылі на чале з Ясінскім на яе вызваленне ад акупантаў невялікія аддзелы рэгулярнага войска Вялікага Княства Літоўскага (у горадзе іх налічвалася крыху болей за 700 чалавек). Вайскоўцам дапамагалі блізу 500 цывільных грамадзянаў Вільні, папярэдне падрыхтаваных да выступу. У выніку нечаканага нападу і кароткага двухгадзіннага бою на вуліцах горада сталіца Княства апынулася ў руках паўстанцаў. У палон разам з камендантам акупацыйнага гарнізона трапіла больш за тысячу чалавек.

## Віленскі Акт паўстання. Утварэнне Найвышэйшай Рады Вялікага Княства Літоўскага

24 красавіка ў Вільні быў урачыста прыняты «Акт Паўстання Народу Вялікага Княства Літоўскага». Згодна з ім утвараўся свой незалежны орган для кіраўніцтва паўстаннем – «Найвышэйшая Рада Вялікага Княства

Літоўскага». Менавіта ёй аддавалася ўся паўніня ўлады ў Княстве. У склад Рады як камендант віленскага гарнізона ўвайшоў і Я. Ясінскі. (Старшыня Рады мусіў змяняцца кожны дзень паводле алфавіта. Прадугледжвалася дапаўненне складу Рады дэлегатамі ад ваяводстваў і паветаў. У такім разе яна мела ўсе падставы ператварыцца ў незалежны паўстанцкі ўрад Вялікага Княства.) Таго ж дня 2328 чалавек падпісалі Акт аб пачатку паўстання і прынялі прысягу на вернасць яму.

Справе больш дэталёвай арганізацыі паўстанцкага руху быў прысвечаны «Ўніверсал да ваяводстваў і паветаў правінцыі Вялікага Княства Літоўскага і гарадоў вольных». Ён быў абвешчаны ўжо ад імя Найвышэйшай Рады 24 і 25 (паўторна) красавіка 1794 года. Пачынаўся «Ўніверсал» словамі: «…Слухай, Народзе Літоўскі, што табе гаворыць не кароль слабы са слабейшага яшчэ трону, не свавольны збор людзей, што нічога акрамя марнага тытулу не маюць, але спакойнае згуртаванне спагадлівых тваіх сыноў, якія доўга для вызвалення твайго працавалі тады, калі Ты ўжо ў ім зняверыўся». «Універсал» абвясціў галоўнымі прыярытэтамі паўстання «здабыццё вольнасці і роўнасці грамадзянскай», выгнанне расейскіх акупацыйных войскаў, вяртанне ўсіх анексаваных земляў Вялікага Княства Літоўскага.

Для абароны паўстання ад ворагаў і здраднікаў быў абраны найвышэйшы Крымінальны суд. З сяброў Найвышэйшай Рады ўтварыліся яе «дэпутацыі» – забяспечання, публічнай бяспекі, скарбу і таемная (для кіраўніцтва войскам).

Трэцяга траўня Найвышэйшая Рада Вялікага Княства прызначыла Якуба Ясінскага начальнікам над усімі паўстанцкімі сіламі ў краі.

25 красавіка пасля першага свайго паседжання найвышэйшы Крымінальны суд вынес смяротны прыгавор апошняму гетману Княства Сымону Касакоўскаму як здрадніку і галоўнаму памагатаму расейскіх акупантаў. Гетмана павесілі прылюдна на «французцкі манер», скарыстаўшыся з вулічнага ліхтара, на пляцы перад віленскай ратушай.

Ад пачатку паўстанне набыло своеасаблівыя рысы,

якія не прадугледжваліся ў Кракаўскім Акце. І рэч тут не толькі ў тым, што імя Касцюшкі нават не прыгадвалася ў Віленскім Акце. (Заяўлялася, аднак, аб поўнай салідарнасці з падзеямі 24 сакавіка ў Кракаве.) Куды істотнейшым быў факт утварэння самастойнага ва ўсіх пытаннях (войска, скарбаў і нават міжнародных дачыненняў) органа – Найвышэйшай Рады Вялікага Княства Літоўскага. (Найвышэйшая Рада Вялікага Княства праіснавала да 10 чэрвеня 1794 года. Потым ёй на змену прыйшла Цэнтральная Дэпутацыя Вялікага Княства Літоўскага, ужо поўнасцю падпарадкаваная Касцюшку і Найвышэйшай Нацыянальнай Радзе ў Варшаве.) Усё гэта выразна спалучалася з якабінскім радыкалізмам Якуба Ясінскага, які яскрава выявіўся ў яго сімпатыях да рэвалюцыйнай Францыі, што абвясціла святым права кожнага народа на свабоду і незалежнасць. Актам 24 красавіка фактычна была адноўленая дзяржаўнасць Вялікага Княства Літоўскага, значна абмежаваная Канстытуцыяй 3 траўня 1791 года.

Аднак неабходнасць змагання з агульным ворагам, наяўнасць супольных мэтаў у паўстанні – здабыццё вольнасці, роўнасці і незалежнасці – болей аб'ядноўвала, чым раз'ядноўвала Варшаву і Вільню. Урэшце ўсё вырашалася на полі бітвы. Гэта выдатна разумеў Я. Ясінскі. Яго асоба аднолькава не задавальняла «памяркоўную плынь» у паўстанні як у Польшчы, так і ў Вялікім Княстве. Пасля пакарання смерцю С. Касакоўскага прывід шыбеніцы ўзнік перад многімі з тых, хто заплямiў сябе супрацоўніцтвам з акупантамі. Яны згуртаваліся супраць «віленскай заразы», стараліся зняць Ясінскага, усялякім чынам зняславіць яго перад Касцюшкам. Тым не меней Ясінскі шукаў доказаў свайму праву на камандаванне паўстанцкім войскам зусім не ў інтрыгах, а на пабаявішчы.

## Першыя бітвы

Адна з такіх бітваў адбылася 7 траўня 1794 года пад вёскай Паляны, у Ашмянскім павеце. Я. Ясінскі хацеў скарыстацца з ініцыятывы, якая на той час поўнасцю была

ў руках паўстанцаў, і разбіць амаль трохтысячны аддзел палкоўніка Дзеева, які пагражаў Вільні. У паўстанцаў было каля дзвюх тысяч рэгулярнага войска. Акрамя гэтага, іх сілы папоўніла амаль тысяча мясцовых сялян-касінераў. Зацятая бітва з удзелам артылерыі пачалася а 11 гадзіне раніцы і доўжылася да самага вечара. Акупанты не чакалі такога моцнага адпору. Урэшце абодва бакі, знясіленыя шматгадзінным боем, вымушаныя былі разысціся. Пры гэтым адыход расейцаў да Смаргоні меў выразнае падабенства да выратавальнага адступлення. Да гэтага прымушалі і немалыя страты – 173 чалавекі забітымі і 322 параненымі. У сваім рапарце пра бой пад Палянамі палкоўнік Дзееў напісаў, што «воины (расейкія) были так раздражены, что не давали пардону (г. зн. дабівалі параненых), но они (паўстанцы) так были отчаянны, что и раненные оборонялись». Акрамя таго, каб апраўдаць свой «канфуз» пад Палянамі, Дзееў «павялічыў» сілы Ясінскага ажно да 11 тысяч чалавек. Сярод іх вылучыў упартасцю ў змаганні асобную групу «канфедэратаў-шляхцічаў, віленскіх стральцоў і мужыкоў, узброеных стрэльбамі, сякерамі, пікамі і косамі».

Пасля бітвы пад Палянамі расейцы нават і думаць не маглі пра які-кольвечы наступ. Галоўнае для іх было стрымаць націск паўстанцаў. Поспех Якуба Ясінскага пад Палянамі прымусіў паспешліва адысці з-пад Горадні на прыкрыццё мяжы пад Нясвіж і трохтысячны корпус генерала Цыцыянава.

Другая буйная бітва беларускіх паўстанцаў пад камандаваннем Я. Ясінскага з расейцамі адбылася 26 чэрвеня пад вёскай Солы, каля Смаргоні. Але гэта быў ужо іншы час, менш спрыяльны для паўстання. Ініцыятыва з розных прычынаў пачала пераходзіць да акупантаў. Не апошнюю ролю ў гэтым адыграла адстаўка Ясінскага з пасады начальніка ўсяго паўстанцкага войска Вялікага Княства. (Ад 4 чэрвеня 1794 года камандзірам паўстанцкіх сілаў у Вялікім Княстве Літоўскім быў прызначаны генерал-лейтэнант Міхал Вяльгорскі, які бяздзейнасцю поўнасцю пацвердзіў сваю няздатнасць да гэтай пасады.)

Пад Соламі сустрэліся буйны пяцітысячны расейскі корпус з 16 гарматамі і аддзелы Ясінскага колькасцю да 3 тысяч чалавек. Ізноў, як і пад Палянамі, у Ясінскага было блізу адной тысячы касінераў. Бітва пачалася ўранку і цягнулася болей за пяць гадзін. Вырашыла справу перавага расейцаў у артылерыі. Паўстанцы, якія мужна стрымлівалі атакі ворага, пад канец бою трапілі пад навальны гарматны агонь і сталі адступаць. У гэтай бітве загінула каля трохсот паўстанцаў (у тым ліку брат Я. Ясінскага – Язэп), бальшыня з іх – неспрактыкаваныя сяляне-касінеры.

Адметнай рысай вызвольнага паўстання 1794 года ў Беларусі было ўжыванне партызанскіх, дыверсійных формаў змагання. Паўстанцы імкнуліся перанесці яго ў т. зв. «расейскі кардон», г. зн. на анексаваную раней тэрыторыю Беларусі. Першага чэрвеня Я. Ясінскі выдаў свой знакаміты ўніверсал да павятовых генерал-маёраў (якія выбіраліся з мясцовай шляхты ў паветах для арганізацыі і кіраўніцтва паспалітым рушаннем і зацвярджаліся Найвышэйшай Радай Вялікага Княства, а потым Т. Касцюшкам) аб тэрміновай арганізацыі спецыяльных конных дыверсійных 300-асабовых аддзелаў. Увайшоўшы ў «расейскі кардон», яны павінны былі адцягваць на сябе сілы акупантаў і, сеючы паніку ў тыле ворага, адначасова ўздымаць на паўстанне мясцовую шляхту і сялянства. Гэтую ініцыятыву заўважыў і ўхваліў Касцюшка. Ён адзначыў, што «ў Літве генерал Ясінскі (загадам Касцюшкі 11 траўня Ясінскаму было нададзенае званне генерал-лейтэнанта) апярэдзіў маю думку, калі выдаў да сваіх суайчыннікаў праўдзівыя звароты ў тым духу і з тымі прадпісаннямі, якіх вымагае парадак рэчаў і якія на ўвесь край павінны быць распаўсюджаныя»[12].

Апрача гэтага ўніверсала Ясінскім была складзеная асобная «Інструкцыя для ўваходных у кардон расейскі». Яна рэгламентавала парадак дзеянняў і паводзін паўстанцаў на акупаванай тэрыторыі. У інструкцыі гаварылася, што, заахвочваючы паўсюдна «шляхту і люд да паўстання...,

[12] Akty powstania Kościuszki. Warszawa, 1955. T.3. S.31–32.

трэба з сялянствам як найлепей, па-людску, абыходзіцца». Партызанскія дыверсійныя дзеянні павінны былі весціся ажно да таго часу, пакуль «хоць яшчэ адзін узброены расейскі салдат застанецца»[13]. У стратэгічным жа плане дыверсійныя акцыі павінны былі прывесці да расшчаплення і аслаблення варожага войска, што дазволіла б больш упэўнена дзейнічаць асноўным сілам паўстанцаў.

Ці не першым скарыстаўся з такой магчымасці сябар Найвышэйшай Рады Вялікага Княства Міхал Клеафас Агінскі. Ён звярнуўся да Ясінскага і атрымаў дазвол на правядзенне разведвальна-дыверсійнага рэйду ў кірунку Менска. 12 чэрвеня, скрытна выйшаўшы з-пад Вільні на чале 500-асабовага аддзела (200 чалавек кавалерыі пад камандаваннем маёра Корсака і 300 стральцоў, узброеных і забяспечаных уласным коштам самога Агінскага), ён накіраваўся пад Валожын. Разбіў там невялікі расейскі гарнізон, захапіўшы пры гэтым значныя запасы вайсковай амуніцыі і харчавання, і рушыў на Івянец. Там Агінскі абвясціў свой зварот да жыхароў Менскага ваяводства. У ім, спасылаючыся на тое, што пасланы ён ад «мужнага генерал-лейтэнанта Ясінскага», заклікаў далучацца да паўстанцаў, каб «вярнуць Айчыне свабоду». З Менска насустрач Агінскаму на загад губернатара Няплюева былі пасланыя значныя сілы. 16 чэрвеня пад Вішневам расейскія войскі сустрэлі і разбілі паўстанцаў. Толькі рэшткі аддзела, 150 чалавек кавалерыі і частка стральцоў, змаглі разам з Агінскім прабрацца пад Крэва да Ясінскага. Неўзабаве пасля гэтага М. Агінскі на загад М. Вяльгорскага быў накіраваны з рапартам аб падзеях ў Беларусі да Касцюшкі. Той, нягледзячы на сумны фінал выправы аддзела Агінскага, усё ж адзначыў яе вартасць і карысць: вораг занепакоены, трэба імкнуцца, каб і надалей ён адцягваў значныя сілы для забяспечання сваіх тылоў.

Прыкладна гэтым жа часам у Паставы з Вільні з конным аддзелам на 60 чалавек быў накіраваны падпалкоўнік Тадэвуш Гарадзенскі. Згодна з інструкцыяй

[13] Mościcki H. General Jakób Jasiński. Warszawa, 1917. S.205.

Ясінскага, ён абвясціў Віленскі ўніверсал аб паўстанні, канфіскаваў мясцовую канцылярыю і грашовую касу. Рука Ясінскага адчувалася і ў далейшых дзеяннях Гарадзенскага. У першы ж дзень знаходжання ў мястэчку ён загадаў паставіць дзве шыбеніцы для здраднікаў. Ніхто павешаны не быў, але з Паставаў атрад Гарадзенскага выйшаў папоўнены 200 чалавекамі «шляхты і ўзброеных сялянаў»[14].

Выконваючы загад Найвышэйшай Рады Вялікага Княства, актыўна дзейнічалі па далучэнні да паўстання шляхты і сялянства Завілейскага павета браты Ксавер і Ян Зяньковічы. У мястэчку Свір з іх удзелам быў скліканы соймік, абраны павятовы генерал-маёр (ім стаў К. Зяньковіч), накіраваны дэлегат ад павета ў Раду. На пачатку чэрвеня аддзел на чале з Я. Зяньковічам напаў на мястэчка Ваўкалаты ў Менскай губерні і разбіў там расейскую каманду.

## Дзейнасць парадкавых камісіяў

Адначасова з вайсковымі дзеяннямі, згодна з распараджэннем Касцюшкі, ішло стварэнне ўстановаў для кіраўніцтва паўстаннем у ваяводствах і паветах, гэтак званых парадкавых камісіяў. Яны займаліся наборам у войска «рэкрутаў», арганізацыяй паспалітага рушання, забяспечаннем яго харчаваннем і амуніцыяй, вялі судовыя справы. На тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага, ахопленай паўстаннем, былі створаныя 23 павятовыя парадкавыя камісіі, 19 з якіх дзейнічалі на беларускай зямлі. Найбольш актыўныя і дзейныя былі берасцейская, кобрынская, гарадзенская і віленская, а таксама ваўкавыская, смаргонская і ашмянская.

Асабліва ўсцешыў Тадэвуша Касцюшку той факт, што яго землякі-берасцейцы ўвялі ў склад сваёй камісіі 8 чалавек ад праваслаўнага насельніцтва, праявіўшы сапраўдную палітычную сталасць і дасведчанасць. Начальнік паўстання з гэтай нагоды адгукнуўся да іх шчырым лістом-падзякай з пажаданнем гэтак жа рабіць і ў іншых мясцінах,

---

[14] Российский центральный государственный архив древних актов, фонд 7, опись 2, ед. хран. 2869, л.201а.

дзе ёсць праваслаўнае насельніцтва. Увогуле для паўстання ў Беларусі было характэрнае імкненне злучыць у змаганні не толькі розныя станы грамадства, але і людзей усіх веравызнанняў – вуніятаў, каталікоў, праваслаўных, мусульман, юдэяў.

## Рэйды М. Агінскага і С. Грабоўскага

Ад пачатку ліпеня 1794 года ўсё больш непакой Цэнтральнай Дэпутацыі Вялікага Княства Літоўскага, якая прыйшла на змену Найвышэйшай Радзе, выклікала становішча Вільні. Расейцы ўсялякім чынам імкнуліся захапіць сталіцу Княства. 17–18 ліпеня першая спроба ўзяць Вільню штурмам не ўдалася. Але з гэтага часу варожыя войскі далёка ад горада ўжо не адыходзілі. Каб адцягнуць адсюль іх сілы, а таксама дапамагчы сваім паплечнікам у Польшчы, у жніўні былі арганізаваныя два найбуйнейшыя дыверсійныя рэйды беларускіх паўстанцаў на Віцебшчыну, Меншчыну і Магілеўшчыну. Іх узначальвалі М. Агінскі і С. Грабоўскі.

1 жніўня напачатку невялікі 50-асабовы конны аддзел Агінскага пакінуў Вільню і праз Немянчын і Свянцяны выйшаў на Браслаўшчыну. Па дарозе ён папоўніўся ўзброенымі фармаваннямі шляхты і сялянаў. Колькасць паўстанцаў павялічылася да дзвюх з паловай тысяч чалавек. На Браслаўшчыне М. Агінскі пакінуў бальшыню свайго аддзела, у тым ліку 1200 касінераў, а сам, узяўшы тры эскадроны конніцы, рушыў на Дынабург (цяпер Даўгаўпілс). Але вызваліць горад не ўдалося. Вестка аб захопе расейцамі Вільні (12 жніўня) прымусіла паўстанцаў павярнуць назад.

Можа, сама адчайную спробу палепшыць справы паўстанцаў у Беларусі ўжо пасля страты Вільні зрабіў у канцы жніўня – пачатку верасня падпалкоўнік Стафан Грабоўскі. 17 жніўня яго амаль дзвюхтысячны аддзел з дазволу М. Вяльгорскага каля Івянца ўвайшоў у «закардонную» Меншчыну. Планаваўся захоп Менска. Але і гэтым разам удача адвярнулася ад паўстанцаў, бо непрыяцельскі гарнізон у

Менску атрымаў значнае падмацаванне. Тады, сышоўшы з ракаўскага гасцінца, аддзел Грабоўскага ў абыход горада праз Койданаў рушыў да Пухавічаў. Па дарозе паўстанцы грамілі расейскія каманды, разбуралі масты, рабілі засекі на дарогах. Паводле сведчання начальніка расейскага войска ў Вялікім Княстве Літоўскім М. Рапніна, у паўстанцаў не было праблемаў з забяспечаннем харчаваннем і фуражом. Па дарозе амаль на паўтары тысячы чалавек папоўніўся лік «грабоўчыкаў». (У аддзеле С. Грабоўскага быў спецыяльны ўпаўнаважаны Цэнтральнай Дэпутацыі Вялікога Княства Ц. Саванеўскі і, відаць, па прыкладзе рэвалюцыйнай Францыі «камісар» Ю. Козел. У іх задачу якраз і ўваходзіла арганізацыя паспалітага рушання сярод мясцовай шляхты і сялянства.) Мясцовае насельніцтва спрыяла іх маршу. І гэта больш за ўсё непакоіла Рапніна, які наогул не мог уцяміць «дерзостного стремления сих мятежников». А тыя яшчэ на вайсковай радзе ў Пухавічах вырашылі ісці ўглыб Беларусі: або «прапасці», або ажывіць згасалае паўстанне.

30 жніўня авангард паўстанцаў дайшоў да Бабруйска. Начным нападам горад быў заняты, а мясцовы гарнізон знішчаны. Ад Бабруйска Грабоўскі павярнуў назад, намерваючыся захапіць Слуцак. Але пад Любанем шлях яму з чатырохтысячным войскам перагарадзіў генерал Цыцыянаў. 4 верасня раніцою пачалася бітва, якая ішла цэлы дзень. Пры гэтым Грабоўскі апынуўся там амаль без пяхоты і значнай часткі конніцы, якія не паспелі напярэдадні пераправіцца цераз раку Арэсу. Паўстанцы біліся мужна, але сілы былі занадта няроўныя. З часткай свайго аддзела на 250 чалавек С. Грабоўскі вымушаны быў капітуляваць.

Сам Касцюшка рэйд Грабоўскага на той час не лічыў неабходным. Даведаўшыся пра яго, ён запатрабаваў, каб паўстанцы выйшлі з «расейскага кардону», адцягнулі свае сілы пад Берасце і Горадню. Тым не меней, той факт, што на нейкі час аддзелу Грабоўскага ўдалося адцягнуць на сябе да 4 тысяч расейскага войска на Беларусі, ужо сведчыў сам за сябе.

## Слава пераможаным!

### На схіле паўстання

Немалыя надзеі ў пашырэнні паўстання на Беларусі пакладаў Тадэвуш Касцюшка на корпус генерала Кароля Серакоўскага. У канцы ліпеня ён накіраваўся з-пад Высокага праз Шарашоў на Слонім. Яго задачай было прыкрыццё Вільні і адначасова недапушчэнне захопу Берасця. З пачатковай колькасці паўтары тысячы чалавек корпус Серакоўскага павялічыўся больш чым удвая коштам добраахвотнікаў з мясцовай шляхты і сялянства. Асабліва дапамаглі яму ў гэтым берасцейская і кобрынская парадкавыя камісіі. З Кобрынскага павета ў корпус улілося 713 чалавек «павятовай міліцыі» і касінераў пад камандаваннем Казіміра Рушчыца. Каля пяцісот чалавек добраахвотнікаў прыйшло з Берасцейскага павета пад камандаваннем павятовага генерал-маёра М. Франкоўскага.

2 жніўня пад Слонімам авангард паўстанцаў Серакоўскага, якіх на той час было ўжо чатыры з паловай тысячы чалавек, сутыкнуўся з перадавой часткай корпуса генерала Дэрфельдэна. Расейскі бок адрозна ад паўстанцаў панёс значныя страты – параненымі і забітымі да трохсот чалавек.

Нягледзячы на, здавалася б, спрыяльныя ўмовы для далейшага наступу пасля Слоніма, Серакоўскі пастанаўляе адысці да Ружанаў, а потым пад Бярозу. Ён не рызыкнуў пайсці на Вільню, а накіраваў туды яшчэ з-пад Слоніма толькі аддзел берасцейскіх добраахвотнікаў-касінераў Франкоўскага. Яны ўзялі чынны ўдзел у абароне горада 11 жніўня, многія загінулі ў акопах і на віленскіх мурах.

Урэшце адыход Серакоўскага пад Бярозу, а потым пад Берасце нельга лічыць беспадстаўным. Надыходзілі звесткі, што з Украіны ідзе на Беларусь шматтысячны расейскі корпус пад камандаваннем Суворава. (8 жніўня расейскі пасол у Стамбуле атрымаў абяцанне Турэччыны захаваць мір з Расеяй, што і дазволіла Кацярыне II перакінуць з турэцкай мяжы корпус А. Суворава.) Менавіта паўстанцам Серакоўскага наканавана было сустрэцца з ім.

## Трасцяніцы крывавыя берагі

17 верасня непадалёк ад Кобрына, пад вёскаю Крупчыцы, з раніцы і да трэцяй гадзіны дня доўжылася найбуйнейшая бітва з часоў паўстання 1794 года ў Беларусі. З абодвух бакоў у ёй удзельнічалі блізу 20 тысяч чалавек. Сярод іх былі і амаль дзве тысячы беларускіх сялян-касінераў, набраных Серакоўскім пад Берасцем, Кобрынам, Пружанамі, Слонімам і Бярозай. З інфармацыі «шматлікіх шпегаў», пераважна мясцовых габраяў, Сувораву былі добра вядомыя бочныя шляхі і падыходы да асноўнай пазіцыі паўстанцаў перад крупчыцкім кляштарам кармелітаў. Флангавым манеўрам, перайшоўшы рэчку Трасцяніцу, аддзелы Суворава змаглі выйсці ў заплечча паўстанцам, захапіць панавальнае над іх пазіцыяй узвышша. Гэта і вызначыла зыход бою. Каб не падставіць свае асноўныя сілы пад знішчальны агонь варожай артылерыі, Серакоўскі аддаў загад адысці. Нават Суворaў вымушаны быў адзначыць мужнасць паўстанцаў: «…атакаваны непрыяцель змагаўся моцна болей за пяць гадзін». Параненымі, забітымі, прапалымі без вестак паўстанцы страцілі блізу дзвюх тысяч чалавек. Бальшыню палеглых складалі малапрактыкаваныя ў вайсковых справах касінеры. Частка іх, ужо пасля бою, была пасечаная азвярэлымі казакамі ў сценах крупчыцкага кляштара, сярод якіх яна шукала сабе паратунку. Берагі рэчкі Трасцяніцы можна назваць крывавымі.

## Катастрофа пад Берасцем

Адвёўшы асноўную частку сваіх сілаў пад Берасце, Серакоўскі разлічваў на іх перагрупоўку, падыход абяцаных падмацаванняў з Польшчы, каб ізноў прыняць бой, засланіць Сувораву шлях на Варшаву. Ён меркаваў, што пасля такой цяжкай бітвы пад Крупчыцамі будзе мець хаця б пару дзён у запасе. Але ўжо праз дзень, 19 верасня, зноў жа нечаканым абыходным манеўрам цераз Мухавец Суворaў на світанні ўдарыў па пазіцыях Серакоўскага пад

Берасцем каля Тэрэспаля. Гэты нечаканы напад спрычыніўся да поўнага разгрому корпуса Серакоўскага, ад якога ацалела толькі 700 чалавек. 2645 паўстанцаў былі забітыя і параненыя або трапілі ў палон.

Цяпер наперадзе ў Суворава заставалася Варшава. У тыле былі толькі невялікія часткі разбітага корпуса Серакоўскага. На іх проста палявалі сувораўскія «чудо-богатыри». Як адзначаў той жа Сувораў, «разбежавшиеся при сражении в леса, кои не сдаются и сами не являются, перестреливают поныне егеря и иная пехота, как то и в болотах, кои в них не потонули»[15]. Тым не менш Сувораў усё ж амаль на месяц змушаны быў затрымацца пад Берасцем, перш чым рушыць на сталіцу Польшчы.

Пасля гэтых падзеяў у Беларусі пад кантролем паўстанцаў заставалася толькі Горадня з часткай Гарадзенскага павета. Сюды ненадоўга пераехала Цэнтральная Дэпутацыя Вялікага Княства Літоўскага. Сюды ж сцягваліся ацалелыя паўстанцкія аддзелы Т. Ваўжэцкага з Жамойці, А. Хлявінскага і П. Грабоўскага з-пад Вільні. Тут знаходзіўся і Я. Ясінскі, які так і не паспеў сфармаваць цалкам сваю надпушчанскую дывізію. 29 верасня ў Горадню ўсяго на адзін дзень прыехаў Т. Касцюшка са сваім сакратаром Ю. Нямцэвічам. Ён пераканаўся, што места ўтрымаць не ўдасца. І таму распарадзіўся пакінуць яго і ўсім накіравацца на абарону Варшавы. 30 верасня апошнія паўстанцкія аддзелы пакінулі Горадню.

Ваенная і палітычная сітуацыя складвалася не на карысць паўстання і ў Польшчы. Яшчэ на пачатку чэрвеня аб'яднаныя расейска-прускія войскі (24 тысячы чалавек) у бітве каля мястэчка Шчакаціны прымусілі армію Касцюшкі (12 тысяч чалавек) адступіць. 15 чэрвеня прускія войскі занялі Кракаў, а Касцюшка вымушаны быў адступіць да Варшавы. У сярэдзіне ліпеня туды падышлі прускія войскі і расейскі корпус пад камандаваннем генерала Ферзена. Аднак гераізм абаронцаў Варшавы і ўмелыя дзеянні Касцюшкі ў жніўні-верасні прымусілі гэтыя войскі адысці

[15] Польская война 1794 года в реляциях и рапортах А. В. Суворова // Красный архив. 1940. Т.4. С.160, 162.

ад горада.

## Бітва пад Мацяёвіцамі

Неўзабаве становішча паўстанцаў значна пагоршылася, бо Аўстрыя пашырыла тэрыторыю сваёй акупацыі, тым самым наносячы ўдар з поўдня. Усё ж Касцюшка не падаў духам і спрабаваў адбівацца на ўсе бакі. Хоць рабіць гэта было ўсё цяжэй і цяжэй: звужалася тэрыторыя паўстання, паўстанцы цярпелі паразы, зняверваліся ў выніках барацьбы, сілы іх былі на зыходзе. Пасля перамогаў Суворава пад Крупчыцамі і Берасцем корпус Ферзена пачаў наступ з паўднёвага захаду. Супраць яго Касцюшка выставіў сваю дывізію, папоўніўшы яе апошнімі рэзервамі з-пад Варшавы. На дапамогу павінна была падысці яшчэ дывізія пад камандаваннем генерала Панінскага, але ён загаду Касцюшкі не выканаў і да месца бітвы гэтая дывізія не паспела. 10 кастрычніка блізу 15 тысяч паўстанцаў на чале з Тадэвушам Касцюшкам занялі пазіцыі каля Мацяёвіцаў. На світанні іх атакаваў колькасна большы корпус генерала Ферзена. Да першай гадзіны дня ішла зацятая бітва. Скончылася яна на карысць расейцаў. Тысячы паўстанцаў загінулі. Цяжка паранены трапіў у палон сам Касцюшка. Страты супрацьлеглага боку таксама былі значныя – больш за 1300 чалавек забітых і параненых.

## Паранены Касцюшка трапляе ў палон

Непрытомны Касцюшка (атрымаў шабельны ўдар у галаў, некалькі ранаў ад казацкіх пікаў) быў абрабаваны і цудам застаўся жывы, бо расейцы пазналі, з кім маюць справу.

## Праз Беларусь у Санкт-Пецярбург

На наступны ж дзень, 11 кастрычніка, Касцюшка пад імем «шляхціча Шыманскага» пры строгай і пільнай ахове быў накіраваны ў Санкт-Пецярбург (праз Кіеў, Чарнігаў,

Магілеў, Шклоў, Віцебск і Ноўгарад). Той факт, што Касцюшка апынуўся ў палоне, адмоўна паўплываў на ход паўстання.

## Пражская разня

Начальнікам узброеных сілаў 12 кастрычніка 1794 года Найвышэйшая Рада прызначыла замест Касцюшкі яго земляка Тамаша Ваўжэцкага, аднак ні аўтарытэт, ні вайсковыя здольнасці не давалі яму магчымасці параўнацца з Касцюшкам. 4 лістапада войскі пад камандаваннем Суворава авалодалі ўмацаваным прадмесцем Варшавы Прагай. (Штурм Прагі Суворавым увайшоў у гісторыю як «пражская разня». Там загінулі тысячы мірных жыхароў, у тым ліку жанчыны, старыя, дзеці, блізу 10 тысяч паўстанцаў, 4 тысячы ўзброеных варшавян-добраахвотнікаў; больш за 2 тысячы патанулі ў Вісле. Бітва за Прагу была надзвычай жорсткая. Сярод яе абаронцаў былі і больш за 5 тысяч беларусаў, якіх Касцюшка паклікаў бараніць апошнюю цытадэль паўстання. На барыкадах Прагі загінуў і легендарны Якуб Ясінскі.) Толькі пасля гэтага было прынятае рашэнне аб капітуляцыі Варшавы.

Менавіта за жорсткае задушэнне паўстання А. Сувораў атрымаў ад Кацярыны II званне фельдмаршала, а таксама больш за 13 000 прыгонных сялянаў Кобрынскага павета. Усяго ж «вызвольнікам» было раздадзена больш за 80 000 прыгонных беларусаў.

## Захоп Варшавы

Ці была параза паўстання 1794 года непазбежная? Вядома, шанцаў на перамогу было няшмат. Яго не падтрымалі шырокія масы сялянства, слабой была буржуазія, а кансерватыўныя колы шляхты ў кіраўніцтве паўстаннем якраз і імкнуліся да таго, каб не дапусціць шырокага выступлення гарадскіх нізоў і сялянства. Акрамя таго, сабатаж і невыкананне распараджэнняў Касцюшкі, а часта і адкрытая здрада падрывалі сілы паўстання.

Пачынаючы паўстанне, Т. Касцюшка ды іншыя кіраўнікі спадзяваліся, што Аўстрыя, Прусія і Расея не змогуць накіраваць значныя сілы супраць паўстання з прычыны ўцягнення іх у барацьбу з Турэччынай і Францыяй. Аднак Прусія і Аўстрыя аслабілі націск на рэвалюцыйную Францыю і сканцэнтравалі значныя сілы супраць Рэчы Паспалітай, не даўшы магчымасці тут вызвольнаму руху спалучыцца з сацыяльнымі пераменамі, здольнымі памяняць аджылыя парадкі.

## Гістарычнае значэнне паўстання

Хоць паўстанне і пацярпела паразу, аднак яго значэнне ў гісторыі Эўропы велізарнае. Ідэі вызвольнага дэмакратычнага руху не загінулі, шырока распаўсюдзіліся ў Аўстрыі, Прусіі, Расеі ды іншых эўрапейскіх краінах.

І гісторыкі, і тагачасныя палітычныя дзеячы адзначалі выратавальную ролю паўстання 1794 года для лёсу Французскай рэвалюцыі. Занепакоенасць дзяржаваў антыфранцузскай кааліцыі – Аўстрыі, Прусіі і Расеі – падзеямі ў Рэчы Паспалітай, адцягненне на задушэнне паўстання значных вайсковых сілаў дазволілі рэвалюцыйнай Францыі настолькі ўзмацніцца, што яна акрыяла і пачала перамагаць. Выйшла так, што Касцюшка цалкам спраўдзіў годнасць ганаровага грамадзяніна Францыі, нададзеную яму яшчэ ў 1792 годзе. Канешне ж, не гэта было галоўнаю мэтай для нашага суайчынніка. Жаданне волі і незалежнасці перш за ўсё сваёй Бацькаўшчыне, лепшай долі яе народу кіравалі яго памкненнямі.

Прычыны паразы паўстання і заняпаду Рэчы Паспалітай караняцца як у нутраных, так і ў вонкавых фактарах, найважнейшымі з якіх былі эканамічнае адставанне і захаванне прыгоннага ладу, а таксама адсутнасць добра арганізаваных органаў улады, здрадніцтва часткі магнатаў і засілле не здольных на кампрамісы вярхоў каталіцкага духавенства, а разам з тым і апалячванне беларусаў і ўкраінцаў. Да вонкавых фактараў належыць імкненне суседніх дзяржаваў знішчыць прагрэсіўны рух у Рэчы

Паспалітай і, скарыстаўшыся з яе эканамічнай, палітычнай і вайсковай слабасці, анексаваць яе тэрыторыю.

## Прычыны паразы. Ці можна было інакш?

Дык можа не варта было ўздымацца на паўстанне? Ці не лепей было захаваць тое, што заставалася ад калісьці неабсяжнай дзяржавы, каб у спрыяльнейшых умовах паспрабаваць вярнуць страчанае? Праз такія пытанні яшчэ некаторыя сучаснікі спрабавалі абвінаваціць Касцюшку. Ён і сам не мог не задаваць іх сабе. Які ж мог быць адказ?

Чаканне перад пашчамі трох драпежнікаў магло прывесці толькі да гібелі. Тактыка ўступак пры першых двух падзелах, якой трымаўся мяккацелы кароль Станіслаў Аўгуст, поўнасцю сябе дыскрэдытавала. Кароль якраз і зыходзіў з таго, што, калі няма моцы ацаліць усё, трэба нечым ахвяравацца, каб захаваць хоць штосьці ад «маці-дзяржавы». Яшчэ пры першым падзеле 1772 года яму слушна пярэчылі: каб выратаваць жыццё маці, «ці ж можа добры сын згадзіцца на тое, каб ёй адсякалі спачатку рукі, а потым ногі?»

Так, паўстанне 1794 года пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі не зберагло Рэч Паспалітую Двух Народаў, не дало волі і незалежнасці ды лепшай долі яе жыхарам. Але яго ўдзельнікі паспрабавалі гэта зрабіць! Не ў мроях, дапушчэннях ці слоўных раскладах, а на пабаявішчы, дзе шмат хто з іх і застаўся. А гэта куды болей істотна. Як і тое, што праз гэтае паўстанне, а потым праз доўгія гады ліхалецця, усвядоміўшы свае ўласныя інтарэсы, пачалі свой пакутны шлях да адраджэння і незалежнасці тыя народы, якія дзвесце гадоў таму былі братамі па зброі. Той шлях паказаў Касцюшка. Становячыся на яго, іх лепшыя сыны ўжо ведалі – за волю трэба змагацца! І са зброяй і без зброі ў руках. Гэтак жа лічыў і адзін з паплечнікаў Касцюшкі, наш нацыянальны герой Якуб Ясінскі. Звяртаючыся пад час паўстання да жыхароў Вялікага Княства Літоўскага, ён казаў: «Хочаце быць свабоднымі? Дык будзьце імі!»

## На чужыне

### У палоне. У Петрапаўлаўскай цытадэлі

Пасля двухмесячнага пераезду 10 снежня 1794 года Касцюшка быў дастаўлены ў Петрапаўлаўскую цытадэль. З першых дзён зняволення ў астрозе ад Касцюшкі і яго паплечнікаў пачалі патрабаваць паказанняў, вусных і пісьмовых. Следчых цікавілі адказы на пытанні пра мэту рэвалюцыі, яе прычыны. Якія былі сувязі кіраўніцтва паўстаннем з Францыяй і Турэччынай? Якое іх стаўленне да Аўстрыі і Прусіі? Што б зрабілі паўстанцы, калі б рэвалюцыя ўдалася? Хто з жыхароў далучаных раней да Расеі правінцыяў падтрымліваў сувязь з Касцюшкам і абяцаў яму дапамогу? Якія былі сувязі Касцюшкі з князем Адамам Чартарыйскім і якія сумы князь прысылаў у падтрымку рэвалюцыі? Адкуль браліся грошы на ўтрыманне войска і вядзенне вайны? Ці падтрымліваў кароль рэвалюцыю? На ўсе гэтыя пытанні Касцюшка вымушаны быў адказваць на допытах, але ад яго не атрымалі патрэбных ім звестак. Ён адказаў, што мэты рэвалюцыі былі адкрыта абвешчаны Актам паўстання, Паланецкім універсалам ды іншымі абнародаванымі дакументамі. Ад Францыі і Турэччыны ніякай дапамогі не атрымлівалі. Стаўленне да Аўстрыі і Прусіі было варожае, асабліваю нянавісць выклікалі паводзіны прускага караля, з якім у Рэчы Паспалітай была дамова аб дружбе, а ён яе вераломна парушыў.

Генерал-пракурор А. Самойлаў, кіраўнік Тайнай экспедыцыі, у якой дапытвалі Касцюшку, рэгулярна дакладваў Кацярыне II пра ягоны стан. Пры канцы сакавіка ён паведаміў ахове Петрапаўлаўскай цытадэлі, што імператрыца дазволіла Касцюшку «з прычыны слабога здароўя гуляць у садзе» блізу дома каменданта, «калі ён пажадае, з тым каб пры ім тым часам па два афіцэры знаходзіліся». Паколькі Касцюшка пакутаваў на хваробу ног (некаторыя меркавалі, што ён яе сімуляваў), яго пачалі вывозіць на свежае паветра ў калясцы. У траўні 1795 года здароўе знакамітага вязня раптоўна пагоршылася: да ранейшых

немачаў дадалася хвароба страўніка. Да яго быў накіраваны штаб-лекар імператрыцы Джон Роджэрсан. Кацярына II загадала, як толькі хвораму стане лепей, перавесці яго ў асобны дом за межамі цытадэлі.

Знаходзячыся ў зняволенні, Касцюшка амаль увесь час ляжаў або сядзеў у крэсле. Пазней займаўся рэззю па дрэве, спрабаваў працаваць на такарным станку. З гэтага можна зрабіць выснову, што нават Кацярына II даволі гуманна і з павагаю ставілася да Касцюшкі. Спачувалі яму і некаторыя прыдворныя.

## Цар Павел I вызваляе Касцюшку з вязніцы

Пасля смерці імператрыцы на трон узышоў Павел I. Ён наведаў Касцюшку 27 лістапада 1796 года і ў часе гутаркі абвясціў пра яго вызваленне. (Ю. Нямцэвіч у сваіх успамінах піша, што першая сустрэча Паўла I з Касцюшкам адбылася 26 лістапада.) Пры гэтай гутарцы прысутнічалі два сыны цара (Канстанцін і будучы імператар Аляксандар I) і прыдворныя.

Праз дзень Касцюшку самога павезлі да цара. Ён падаў спіс паўстанцаў, якія знаходзіліся на паўночным Урале, у Сібіры, на Камчатцы, з просьбай аб іх вызваленні. Гэтая просьба была неадкладна задаволеная. Павел I распарадзіўся вызваліць усіх зняволеных і сасланых паўстанцаў.

Гэтакі крок Паўла I быў, аднак, абумоўлены неабходнасцю прыняцця Касцюшкам «прысягі на вернасць». І ён вымушаны быў прыняць умову. Цікава, што ў беларускім фальклоры гэты факт набыў своеасаблівую афарбоўку: «Як Касьцюшку злавілі, то зараз прывялі перад цара, дай казалі яму, каб ён прысягнуў Расеі, так ён сказаў: «На чыёй зямлі стаю, таму прысягаю і за таго голаў палажу!» А ён уперад набраў зямлі ў чобаты, як з Польшчы выяжджаў, і на той зямлі прысягаў: от таму ён і не зьняверыўся»[16].

Павел I прапанаваў таксама Касцюшку атрымаць маёнтак з 1000 душ прыгонных сялянаў, ад чаго той

---

[16] Federowski M. Lud białoruski na Rusi litewskiej. Kraków, 1903. T.3, cz.2. S.11.

адмовіўся і замест гэтага атрымаў буйную суму грошай (паводле звестак Нямцэвіча, 60 тысяч рублёў срэбрам). Аднак Касцюшка цвёрда адмовіўся ад прапановы імператара «ўступіць у службу расійскую». Ён заявіў Паўлу І, што можа змагацца толькі пад харугвамі незалежнасці ў Амэрыцы ці Рэчы Паспалітай.

Стаўленне Паўла І да Касцюшкі ды іншых палонных паўстанцаў выклікала недаўменне не толькі ў сучаснікаў. Так, савецкі гісторык М. М. Пакроўскі пісаў: «Павел пачаў заступацца за палякаў, вызваліў героя апошняй польскай вайны Касцюшку, які сядзеў у зняволенні, а генерала Суворава, які ўзяў Прагу, выгнаў у адстаўку. Усё гэта ён зрабіў без усялякага разліку, проста па сваёй шалапутнасці»[17].

На самой жа справе Павел І праводзіў разумную, дальнабачную палітыку. У гутарцы з былым маршалкам земскім Вялікага Княства Літоўскага Ігнатам Патоцкім, актыўным дзеячом паўстання, Павел І гаварыў: «Я быў заўсёды супраць падзелу Польшчы, лічыў яго як несправядлівым, так і палітычна памылковым. Каб адрадзіць Польшчу, неабходна згода трох дзяржаў, але на гэта не згодзіцца Аўстрыя, яшчэ менш Прусія, не абвяшчаць жа мне ім вайну? Дзяржава мая пасля такіх працяглых і непатрэбных войнаў вельмі ж міру жадае»[18]. Пасля смерці Паўла І некаторы час такую ж палітыку праводзіў і Аляксандар І, які дамогся вызвалення часткі польскіх земляў ад аўстрыйскага і прускага ўладарніцтва і ўтварэння Каралеўства (Царства) Польскага ў складзе Расейскай імперыі.

### Падарожжа ў Швецыю, Ангельшчыну і Амэрыку

Касцюшка, атрымаўшы свабоду разам з сваім ад'ютантам і сакратаром Юльянам Нямцэвічам, дарэчы ўраджэнцам Берасцейскага павета, пастанавіў выехаць у Злучаныя Штаты Амэрыкі. 18 снежня 1796 года Касцюшка наведаў Паўла І і падзякаваў яму за прыязнасць. (Паколькі

---

[17] Покровский М. Н. Избранные произведения. М., 1967. Кн.3. С.118.
[18] Niemcewicz J. Pamiętniki czasów moich. Paryż, 1848. S.296.

Касцюшка па-ранейшаму хадзіў з цяжкасцю, да ўваходу ў Зімовы палац былі пасланыя кавалергарды з крэслам царыцы, у якім яго і транспартавалі.) Павел I і ўся яго сям'я зычліва сустрэлі яго і пажадалі шчаслівай дарогі. 19 снежня Касцюшка з Нямцэвічам пакінулі Пецярбург.

Пасля непрацяглага знаходжання ў Стакгольме і Лондане 18 чэрвеня 1797 года Касцюшка выехаў з Брыстоля ў Амэрыку і праз два месяцы плавання па Атлантычным акіяне прыбыў у Філядэльфію.

Касцюшка меркаваў, што ў Амэрыцы жывуць свабодныя і шчаслівыя грамадзяне, за свабоду якіх ён змагаўся. Аднак яго надзеі не спраўдзіліся: у Злучаных Штатах працягвала захоўвацца рабства больш цяжкае, чым прыгоннае права. Разам з тым Касцюшку не пакідала думка вярнуцца ў Эўропу і працягваць барацьбу за свабоду на радзіме. Пад час знаходжання ў Амэрыцы Касцюшка сустрэўся з сваімі баявымі сябрамі і таварышамі. Кангрэс Злучаных Штатаў прыняў пастанову аб выплаце Касцюшку грошай за мінулую службу і прызначыў яму пенсію.

## Вяртанне ў Эўропу

Французскі ўрад (Дырэкторыя), жадаючы скарыстаць патрыятычна настроеных эмігрантаў з Рэчы Паспалітай, у студзені 1797 года пачаў фармаваць у паўночнай Італіі «польскія» легіёны пад лозунгамі свабоды, роўнасці і братэрства («За вольнасць нашу і вашу»). Яны выкарыстоўваліся французскім камандаваннем у барацьбе з Аўстрыяй. Імкнучыся скарыстаць аўтарытэт Касцюшкі для арганізацыі паўстання ў Заходняй Украіне і Паўднёвай Польшчы супраць Аўстрыі, Дырэкторыя праз свайго консула ў Філядэльфіі схіліла яго абяцаннем ваеннай дапамогі ў барацьбе за вызваленне Рэчы Паспалітай да вяртання ў Эўропу.

## Касцюшка і Напалеон

5 траўня 1798 года Касцюшка выехаў з Амэрыкі і ў ліпені прыбыў у Парыж. Тут ён сустракаўся з прадстаў-

нікамі Дырэкторыі, а таксама з Напалеонам I (17 кастрычніка і 6 лістапада 1799 года). Гэтыя перамовы ні да чога не прывялі. Касцюшка пераканаўся, што буржуазны ўрад Францыі кіруецца толькі сваімі эгаістычнымі інтарэсамі.

Знаходзячыся ў Францыі, Касцюшка, паддаўшыся ўгаворам Талейрана, напісаў зняважлівы ліст Паўлу I, абвясціў яму пра адмову ад прысягі і вярнуў атрыманыя ад яго грошы.

У гэтым жа часе ён наладзіў больш блізкія кантакты з салдатамі і афіцэрамі польскіх легіёнаў, якія знаходзіліся ў Італіі. Аднак змагацца за радзіму ім не давялося. Французскі ўрад скарыстаў іх для вядзення вайны ў інтарэсах французскай буржуазіі ў Італіі, Эгіпце ды іншых мясцінах, дзе частка іх загінула.

Пачынаючы вайну з Прусіяй, Напалеон праз свайго міністра Фушэ паспрабаваў выкарыстаць Касцюшку для вярбоўкі новых польскіх легіёнаў. У гутарцы з Фушэ ў 1806 годзе Касцюшка сказаў: «Служыў я Айчыне пры розных абставінах, з большым ці меншым шчасцем. Нічога больш не жадаю, як служыць ёй сёння. Але навучаны горкім вопытам, у якім мае землякі заўсёды былі пераможаныя, панеслі нечуваныя страты ў Італіі, у Эгіпце, на Сан-Дамінга, пад Марэнга, пад Гагендліндэнам, пасля перашкодаў і горычы, якія я сам адчуў, пра што гаварылася ў маёй брашуры 1800 года, нарэшце, таксама з бітвы пад Аўстэрліцам не пажадалі атрымаць ніякай карысці для Польшчы, бачу, што імператар Напалеон і пан міністр палічаць абгрунтаваным, што жадаю для Польшчы сякіх-такіх гарантый і якога-небудзь тлумачэння» [19]. У далейшай гутарцы Касцюшка прапанаваў, каб імператар Напалеон прызнаў, што настаў час, калі Польшча (мелася на ўвазе ўся Рэч Паспалітая) можа і павінна быць адноўленая, з адпаведнай канстытуцыяй, з абвешчаннем палітычнай роўнасці ўсіх без вынятку жыхароў, як гэта ёсць у Францыі. Фушэ заявіў, што Напалеон ніякіх абяцанняў і гарантыяў даваць не будзе, і прапанаваў Касцюшку падпісаць

---

[19] Kopczewski J. Tadeusz Kościuszko w historji i tradycji. Warszawa, 1968. S.95.

пракламацыю-зварот да суайчыннікаў з заклікам выступіць у падтрымку Напалеона, а калі Касцюшка адмовіцца яе падпісаць, то ўсё роўна яе зачытаюць ад яго імя.

## У спадзяванні на лепшую будучыню

## Грамадска-палітычны запавет. Праграма барацьбы за свабоду

Ідэі Вялікай французскай рэвалюцыі, а таксама вызвольнай барацьбы паўночнаамэрыканскіх калоній зрабілі на Касцюшку вялікі ўплыў. На працягу ўсёй сваёй палітычнай дзейнасці ён глыбока паважаў і быў паслядоўным прадаўжальнікам вызвольных, антыфеадальных ідэяў Ж. Ж. Русо, Ш. Мантэск'ё, Т. Джэфэрсана ды іншых прагрэсіўных дзеячоў. Яго светапогляд, грамадска-палітычныя і праўныя ідэі найбольш поўна былі выкладзеныя ў брашуры «Ці могуць палякі дамагчыся незалежнасці», выпушчанай ананімна ў Парыжы ў 1800 годзе, з фіктыўным месцам выдання – «У Прыкопе-на-Доне». Мяркуюць, што запіс ідэяў і разважанняў Касцюшкі, выкладзеных у брашуры, быў ажыццёўлены яго сакратаром Ю. Паўлікоўскім. У брашуры разглядаюцца слабыя і моцныя бакі вызвольнага руху ў Рэчы Паспалітай. Яна складаецца з прадмовы, чатырох частак і заканчэння.

## Вера ў свае сілы – неабходная ўмова вызвалення народа

У прадмове аўтар папярэджвае сваіх землякоў, каб не спадзяваліся на замежную дапамогу, а калі хочуць «шчасця, гонару і славы..., неабходна карыстацца сродкамі і сіламі, якія прырода дала чалавеку..., пажадаем толькі – і мы станем свабоднымі, бо шаснаццацімільённы народ не можа быць народжаны для рабства». Вызначаючы колькасць насельніцтва ў 16 мільёнаў чалавек, Касцюшка меў на ўвазе не толькі палякаў, але і беларусаў, украінцаў і жамойтаў, якія складалі тады Рэч Паспалітую.

У першай частцы аўтар аналізуе прычыны, якія прывялі да заняпаду Рэчы Паспалітай. Ён паказвае, што першай прычынай з'яўляецца страта народам сілы духу, страта веры ў свае сілы і антынародная палітыка магнатаў,

калі шляхта пачала «імкнуцца не да дабрабыту краіны, а да задавальнення ганарлівасці... Магнаты былі зацікаўленыя ў тым, каб пераканаць нацыю ў яе нікчэмнасці і слабасці, у тым, быццам яна нічога не можа дасягнуць сваімі ўласнымі сіламі, без дапамогі суседняй дзяржавы, бо яны ўзбагачаліся, гандлюючы яе крывёю ля падножжа тронаў. Магнаты былі зацікаўленыя ў аслабленні духу сваіх суайчыннікаў, у прыніжэнні іх годнасці для таго, каб, не ведаючы сваёй сілы, яны не маглі скінуць з сябе ганебнай апекі, у адваротным выпадку магнаты страцілі б увесь свой уплыў і аўтарытэт». З гэтых разважанняў Касцюшкі відаць, што першачарговай прычынай заняпаду Рэчы Паспалітай ён лічыў нутраныя супярэчнасці і асабліва эгаізм магнатаў.

Адначасова ён адзначаў, што ў краіне, дзе ёсць урадлівыя землі, сяляне амаль паміраюць ад голаду, слаба развітыя прамысловасць, рамяство, навука, а «шляхта ўмела толькі тыраніць сялян». Правільна крытыкуючы ўвесь тагачасны лад, Касцюшка разам з тым не зрабіў высновы пра неабходнасць яго ліквідацыі, а толькі прапанаваў памешчыкам зрабіць некаторыя ўступкі сялянам, што было выкладзена ў Паланецкім універсале.

Заклікаючы сваіх суайчыннікаў да барацьбы за свабоду, аўтар трактата звярнуў увагу на досвед барацьбы за незалежнасць народаў Швайцарыі, Галандыі, Паўночнай Амэрыкі, якія ніколі не былі б паважанымі народамі, калі б не адбілі захопнікаў сваімі ўласнымі сіламі. Найбольш тыповым прыкладам ён лічыў барацьбу Францыі, супраць якой сабраліся ўсе каралі Эўропы з мэтай пакарыць гэтую нацыю і аднавіць у ёй стары лад. На думку аўтара, французы не былі гатовы ў вайсковым дачыненні, аднак, упэўненыя ў справядлівасці сваёй справы, яны не толькі выгналі непрыяцеля з сваёй Айчыны, але і дасягнулі такой славы і магутнасці, што скідалі троны. Думка Касцюшкі грунтавалася на тым, што ваенная навука не можа зводзіцца да матэматычных разлікаў, а таму некалі галандцы змаглі адбіць у шмат разоў большыя сілы гішпанцаў, швайцарцы – аўстрыйцаў, амэрыканцы – ангельцаў.

У другой частцы разгледжана магчымасць новага

паўстання, яго тактыка і стратэгія. Аўтар адзначыў, што сілы рэвалюцыі могуць павялічвацца за кошт вызвольнай барацьбы працоўнага народа суседніх дзяржаваў, якія падзялілі Рэч Паспалітую. «Хіба расейскі селянін, жорстка прыгнечаны сваімі абшарнікамі, у спрыяльных умовах не кінецца з запалам супраць сваіх прыгнятальнікаў, імкнучыся скінуць сваё ярмо? Няўжо прыгнечаны казак не імкнецца зноў атрымаць свае свабоды?.. Прусак… пачынае разумець, што ён не быдла, якое знаходзіцца ў распараджэнні казны. Некаторыя правінцыі з радасцю скінулі б сваё ярмо». На пачатку паўстання рэкамендуецца весці барацьбу невялікімі партызанскімі аддзеламі. Разам з тым у трактаце абвешчана неабходнасць захавання і аховы права прыватнай уласнасці. Робіцца агаворка і пра тое, што «хоць прынцыпы свабоды і роўнасці дапускаюць усіх аднолькава да займання ўрадавых пасад, аднак… я б жадаў, каб асобы, якія зоймуць месцы ва ўсіх магістратах, былі абраныя з ранейшых станаў», г. зн. са шляхты і мяшчанства.

У трэцяй частцы асноўная ўвага аддадзена пытанням маралі і права ў часе рэвалюцыі: «Рэвалюцыя праводзіцца не для таго, каб зняць усякую аброць з свавольства, наадварот, яна мае на мэце ўсталяваць парадак, падпарадкаваць закону ўсякія правапарушэнні, прывучыць падпарадкоўвацца ўладам, установленым нацыяй, ахоўваць уласнасць кожнага, што складае аснову грамадства. Усім даецца аднолькавая свабода і роўныя правы, але нікому не дазваляецца ўчыняць злачынствы… Правасуддзе павінна быць гразой для злачынцаў, але не помстай; невінаватым жа яно служыць прытулкам. Тыя, хто думае, што важней не ўпусціць злачынцаў, чым захаваць бяспеку невінаватых, робяць жудасную памылку… Хто не паважае ўсталяванай над ім улады, парушае правы нацыі, учыняе крыўды і рабункі, той разбойнік і злодзей. Рэвалюцыя якраз і мае на мэце выпраўленне заганаў, знішчэнне злачынстваў і ўкараненне ў сэрцы ўсіх грамадзянаў міласэрнасці і дабрачыннасці». Далей аўтар адзначае, што ў яго на радзіме сярод простага люду няма злачыннасці і можна спакойна хадзіць праз вялікі лес, не баючыся нікога.

У сваіх разважаннях аб маралі, праве, злачыннасці і правасуддзі Касцюшка асуджае тэрор, які практыкаваўся ў часе Вялікай французскай рэвалюцыі, лічачы, што гэта выключная асаблівасць французскай нацыі або нават некаторай «шайкі разбэшчаных злачынцаў». Ён прыхільнік строгага захавання праўных нормаў, выпрацаваных у ходзе буржуазнай рэвалюцыі, адначасова ён выказаўся супраць самавольства з чыйго б ні было боку. Яго маральныя і праўныя ідэі ўвасаблялі інтарэсы рэвалюцыйна настроенай шляхты і буржуазіі і зыходзілі з прынцыпу карысці для вызвалення народа (нацыі) ад улады манархічных дзяржаваў, якія забралі яго край. На ягоную думку, настаў час шырокай асветы народа і яго актыўнага ўдзелу ў грамадскіх справах. А палітычнай асвеце народа і павышэнню яго грамадскай актыўнасці садзейнічае свабода друку.

З асветай народа разбураюцца і розныя палітычныя забабоны, такія, як вера ў выключнасць каралеўскай улады і шляхты: «Кожны ведае, што яны не валодаюць упрывілеяваным розумам; чаму ж яны прыўлашчылі сабе права распараджацца лёсам нацыі насуперак яе волі?» Усё гэта дазваляе зрабіць выснову, што Касцюшка паводле грамадска-палітычных і праўных поглядаў стаяў на больш прагрэсіўных пазіцыях, чым бальшыня буржуазных ідэолагаў таго часу.

У чацвертай частцы разглядаецца пытанне пра матэрыяльнае забяспечанне паўстання. Адзначаецца, што прамысловасць – гэта сіла, якая творыць багацці, якая можа развівацца на поўную сілу толькі пры свабодзе, гаворыцца аб прыродных багаццях краіны. Разам з тым адзначаецца, што «ў часе рэвалюцыі неабходна прыносіць ахвяры: трэба задавальняцца малым, калі мы хочам дамагчыся волі».

У заканчэнні аўтар падкрэслівае, што ў народа, які жадае свабоды і верыць у перамогу, ёсць усе падставы для дасягнення высакароднай мэты. Калі ўсе будуць мужна змагацца, то праціўнік, нават калі ён будзе больш шматлікі, усё ж не зможа перамагчы.

Увесь трактат прасякнуты духам аптымізму, верай у перамогу справы. Ён з'яўляўся тэарэтычнай і практычнай

праграмай барацьбы за дэмакратыю і незалежнасць. Палітычныя і праўныя ідэі Касцюшкі, выкладзеныя ў трактаце, перадвызначалі новы кірунак у палітычнай барацьбе і спрыялі падрыхтоўцы і зараджэнню рэвалюцыйнага і дэмакратычнага руху ў Польшчы, Беларусі і Украіне.

У трактаце ёсць некаторыя спрашчэнні і памылковыя сцверджанні. Перабольшана значэнне баявой сілы шляхоцкай конніцы і сялянскай масы. У цэлым жа асноўная думка аб тым, што калі ўвесь народ паўстане аднадушна, то ён атрымае перамогу, не выклікае сумневу.

Пад час знаходжання ў Францыі ад 1798 і да сярэдзіны 1815 года Касцюшка шмат часу аддаваў сваім мастацкім захапленням: маляваў, працаваў на такарным станку, выточваў розныя драўляныя рэчы. Разам з тым цікавіўся вайсковай справай. У 1808 годзе выдаў у Нью-Ёрку брашуру «Манеўры коннай артылерыі», другое выданне якой выйшла ў 1809 годзе ў Лондане. У ёй падсумоўваўся досвед выкарыстання артылерыі ў Амэрыцы і Эўропе і ў сувязі з гэтым даваліся рэкамендацыі па тактыцы.

## Сустрэчы і перапіска з Аляксандрам I

Разгром напалеонаўскай арміі адрадзіў у Касцюшкі надзеі на магчымасць аднаўлення Рэчы Паспалітай пад пратэктаратам Расеі. Пра свае планы гэтага аднаўлення Касцюшка гутарыў з імператарам Аляксандрам I першым разам у Парыжы ў красавіку 1814 года і другім разам у Браўнаў у траўні 1815 года. Яшчэ да асабістай сустрэчы Касцюшка напісаў ліст Аляксандру I, у якім прасіў абвясціць поўную амністыю тым сваім суайчыннікам, якія ўдзельнічалі ў паходзе Напалеона на Маскву, а таксама скасаваць прыгоннае права на анексаваных Расеяй землях. Аляксандар I абяцаў Касцюшку падтрымаць яго прапановы і прыняў яго ў Парыжы з вялікай пашанай.

Аб змесце ліста да цара і гутарак Касцюшкі з Аляксандрам I дазваляе меркаваць ліст да Т. Джэфэрсана, у якім Касцюшка пісаў: «Цар Аляксандар абяцаў мне павялічыць княства Варшаўскае аж да Дзвіны і Дняпра,

даўніх нашых межаў, але яго выдатным і зычлівым жаданням запярэчыў яго кабінет…, пісаў цару і прасіў яго, каб мне пісьмова пацвердзіў свае абяцанні, што мне вусна абяцаў стварыць канстытуцыйны ўрад, ліберальны і незалежны, вызваленне нашых няшчасных сялянаў, зрабіўшы іх нават уласнікамі зямлі, якой валодаюць, чым адным зрабіўся б бессмяротным, – але ўсё з дымам пайшло». Ліст Касцюшкі і яго сустрэчы з Аляксандрам І усё ж далі пэўны вынік. Цар абвясціў амністыю ўсім жаўнерам і афіцэрам, выхадцам з Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага, якія знаходзіліся ў Францыі, дазволіў ім вярнуцца на радзіму са зброяй і з захаваннем вайсковых званняў, пакінуўшы ўвесь корпус на вайсковай службе і аддаўшы яго пад камандаванне свайго брата, вялікага князя Канстанціна. Быў заснаваны Арганізацыйны камітэт, які садзейнічаў вяртанню вайскоўцаў на радзіму. Кантакты з Касцюшкам узвысілі аўтарытэт Аляксандра І у вачах эўрапейскай грамадскасці, дазволілі яму заняць больш цвёрдую пазіцыю ў перамовах з Прусіяй і Аўстрыяй на Венскім кангрэсе, у выніку чаго ў траўні 1815 года былі падпісаныя пагадненні паміж Расеяй, Прусіяй і Аўстрыяй аб Варшаўскім княстве, а 9 чэрвеня – генеральны акт Венскага кангрэса.

Паводле трактата Венскага кангрэса заходняя і паўночная часткі Польшчы заставаліся ва ўладанні Прусіі, паўднёвая частка Польшчы і частка Ўкраіны – у Аўстрыі. Цэнтральная частка Польшчы была далучаная да Расеі і склала Каралеўства (Царства) Польскае. 27 лістапада 1815 года Аляксандар І падпісаў канстытуцыю Польскага Каралеўства, якая тады была найбольш ліберальнай у Эўропе. У ёй захоўвалася некаторая пераемнасць Канстытуцыі 1791 года, прадугледжвалася выбарнасць адміністрацыі і суддзяў, выбарчае права пашыралася на значную частку насельніцтва, што дасягалася параўнальна нізкім маёмасным цэнзам, парламент абіраўся наўпроставымі выбарамі ўсімі станамі грамадства з удзелам, хоць і вельмі нязначным, сялянаў.

## Апошні прытулак у Швайцарыі

Улетку 1815 года Касцюшка пераехаў на сталае жыхарства з Францыі ў Швайцарыю, у гарадок Салюр. Пераезд быў выкліканы тым, што пасля рэстаўрацыі Бурбонаў у Францыі пачаўся пераслед былых удзельнікаў рэвалюцыі, была абмежаваная свабода друку, узрос уплыў рэакцыйнага святарства, супраць чаго ўсё жыццё змагаўся Касцюшка. Пераехаўшы ў Швайцарыю, Касцюшка працягваў актыўна ўдзельнічаць у грамадскім жыцці. У лісце да Адама Чартарыйскага ён прапаноўваў аддаць асаблівую ўвагу народнай асвеце. Адам Чартарыйскі быў найбліжэйшым дарадцам Аляксандра I, у 1803 годзе стаў куратарам Віленскай навучальнай акругі, куды ўваходзілі ўсе беларускія губерні, з 1805 года – сябрам Сената і Дзяржаўнай рады. Шэраг школаў на Беларусі быў адчынены з ініцыятывы Чартарыйскага, у тым ліку і вядомая Свіслацкая гімназія. Касцюшка прапанаваў выдаць пастанову, каб кожны ўласнік быў абавязаны ў сваім маёнтку стварыць школу для сялян і ў адпаведнасці з агульным коштам маёнтка асігнаваць грошы на ўтрыманне настаўнікаў, акрамя таго, на гэтыя ж мэты трэба было выдаткоўваць і царкоўную «дзесяціну», якую плацілі сяляне. Ураду таксама рэкамендавалася паклапаціцца аб адкрыцці рамесных навучальняў, дзе б вучыліся рамёствам: сталярнаму, цяслярскаму, кавальскаму, такарнаму, слясарнаму і інш. Для лепшага азнаямлення з найбольш перадавымі метадамі школьнага навучання ў траўні 1816 года Касцюшка наведаў настаўніцкі інстытут у Івердоне, дзе меў гутарку з яго стваральнікам, выдатным педагогам-дэмакратам Ёганам Гайнрыхам Песталоці. Касцюшка, гэтак жа як і Песталоці, меркаваў, што палепшанне жыцця працоўных можа быць дасягнутае ў рамках тагачаснага ладу шляхам адукацыі і выхавання.

У лісце Касцюшкі да А. Чартарыйскага гаварылася таксама, што неабходна палепшыць умовы жыцця простых людзей, а для гэтага трэба паступова зменшыць паншчыну і заахвочваць выкарыстанне найманых работнікаў для

палявых работ і быць суровым для валацугаў, п'яніц, дармаедаў, якіх трэба скарыстоўваць на публічных работах, будаўніцтве дарог, каналаў, для брукавання вуліц з выплатай сціплай нагароды. Для развіцця прамысловасці трэба адкрываць новыя фабрыкі: суконныя, папяровыя, металургічныя ды інш. Далей ён прапанаваў зрабіць захады, каб з часам усе сяляне маглі вызваляцца ад залежнасці і атрымаць ва ўласнасць зямлю.

Памёр Касцюшка ў Швайцарыі ў Салюры 15 кастрычніка 1817 года. Пахаванне адбылося 19 кастрычніка там сама. У 1818 годзе парэшткі Касцюшкі былі ўрачыста перавезеныя ў Кракаў і змешчаныя ў каралеўскім замку Вавель. Смерць Касцюшкі выклікала шырокі водгук ва ўсім свеце. У многіх краінах, дзе жылі эмігранты з Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага, памяць славутага ліцьвіна ўшанавалі памінальнымі службамі ў касцёлах і сходамі.

## «Наш Касьцюшка слаўны быў»

Амаль палову жыцця Тадэвушу Касцюшку давялося правесці па-за межамі сваёй Бацькаўшчыны. За час паўстання другім і апошнім разам пабываў ён там ужо пасля бітвы пад Мацяёвіцамі. Параненага героя пад пільнай аховаю, пад чужым імем везлі з Польшчы праз Гомель, Магілеў, Шклоў, Воршу і Віцебск у Петрапаўлаўскую цытадэль... Так, па сутнасці, пачаўся яго шлях у выгнанне.

Але крэўная сувязь з радзімай, Літвой-Беларусяй, яе людзьмі і яе лёсам ніколі не слабела. У чэрвені 1794 года ў адным з сваіх зваротаў Т. Касцюшка пісаў: «Літва! Землякі і суайчыннікі мае! На вашай нарадзіўся зямлі і ў запале праведным для маёй Бацькаўшчыны адгукаецца ўва мне найасаблівейшая прывязанасць да тых, спаміж каго распачаў я жыццё». Гарачым жаданнем Касцюшкі было разам з сваімі землякамі-ліцьвінамі змагацца за волю роднага краю, які, як ён лічыў, «доўга нешчаслівы праз здрады ўласных сыноў». У Амэрыцы, Францыі і Швайцарыі перш за ўсё яго турбаваў лёс Радзімы.

Верыў Касцюшка ў лепшую будучыню сваёй

Бацькаўшчыны, не лічыў яе нешчаслівы гістарычны лёс канчаткова вырашаным. У лісце да Аляксандра I за два гады да смерці ён пісаў: «Нарадзіўся я ліцьвінам... смуга будучыні яшчэ пакрывае лёс маёй роднай зямлі...»

Беларусы заўжды шанавалі памяць пра Тадэвуша Касцюшку. У легендах, паданнях, песнях захоўвалі яны светлы ўспамін пра свайго земляка-заступніка: «Касьцюшка зваяваў бы сьвет цэлы, каб паны яго слухаць хацелі, але паны, як паны: гулялі, банкеталі, Касьцюшкі не слухалі, затым і Польшча прапала». «Кажуць, што ў Касьцюшкі то быў такі плашч, што кулі яго не прабівалі: аднаго разу маскалі на яго зьнячэўку напалі, так ён не пасьпеў таго плашча злажыць, так яго чыста пасеклі і забралі» [20]. Прызнаннем Касцюшкі за свайго абаронцу гучыць і беларуская народная песня, якую спявалі і праз сто гадоў пасля паўстання:

Наш Касьцюшка слаўны быў,
Маскалёў ён добра біў...

Яшчэ на пачатку 60-х гадоў мінулага стагоддзя на Лепельшчыне была запісаная, а пазней апублікаваная песня пра Касцюшку, які, паводле народнай версіі, загінуў у бітве. (Пра гэта паведаміў Аляксей Каўка, за што выказваем яму шчырую падзяку.) Невыказныя туга і смутак чуваць у гэтых словах:

Вазьмі, маці, пяску жменю,
Пасей на каменю.
Калі той пясок узыйдзе,
Касьцюшка з вайны прыйдзе.

Ляціць воран цераз мора,
А лятучы, крача.
А хто ж майго Касьцюшачкі
Магілку аплача.

---

[20] Federowski M. Lud białoruski na Rusi litewskiej. Kraków, 1903. T.3, cz.2. S.11.

Да гераічнай постаці правадыра паўстання 1794 года звяртаўся наш другі выдатны суайчыннік Кастусь Каліноўскі. У адным з нумароў «Мужыцкае праўды» ў 1862 годзе ён пісаў пра Касцюшку як пра народнага заступніка, заклікаў да яднання і змагання па прыкладзе паўстанцаў 1794 года.

Т. Касцюшку прысвечаныя многія творы мастацкай літаратуры, жывапісу, скульптуры, пра яго жыццё і дзейнасць напісаныя навуковыя працы. У шмат якіх краінах Эўропы, Амэрыкі і нават у далёкай Аўстраліі пастаўлены яму помнікі. Шанаванне памяці Касцюшкі ў свеце – сведчанне павагі і да народа, які яго спарадзіў.

Справядліва кажуць, што нават і без аднаго чалавека народ няпоўны. Без вяртання ж імя Касцюшкі, як і шмат якіх іншых забытых дзеячоў нашай гісторыі, гэтая гісторыя будзе не толькі няпоўная, але і несправядліва абкрадзеная.

У 1994 годзе ўпершыню за дзвесце гадоў урачыста адзначаліся ўгодкі паўстання ў Беларусі. З гэтаю мэтай быў створаны грамадскі Нацыянальны арганізацыйны камітэт, у склад якога ўвайшлі вядомыя дзеячы культуры, навукоўцы, літаратары, сябры шматлікіх грамадскіх згуртаванняў – дэмакратычных партыяў, таварystваў, суполак. Ушанаванне памяці палеглых у бітвах, стварэнне помнікаў і мемарыяльных таблiцаў, наданне вуліцам і пляцам імёнаў герояў паўстання – кірункі дзейнасці гэтага камітэта.

Андрэй Тадэвуш Касцюшка – «сябар прыгнечаных, вораг прыгнятальнікаў», наш нацыянальны герой – вяртаецца з выгнання на сваю Бацькаўшчыну, у сваю Літву-Беларусь.

© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2017
© PDF: Камунікат.org, 2017